

МІС БЕЛАРУСЬ. МАРЫ І ПЛАНЫ. 5

ТАДЭВУШ КАСЦЮШКА Ў ФІЛАДЭЛЬФІІ І ВІЛЕЙЦЫ... 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 ЧЭРВЕНЯ 2018 г. АЎТОРАК № 115 (28731)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Стратныя прадпрыемствы і выплата заработнай платы — тыя накірункі, якімі павінны займацца мясцовыя органы ўлады. Калі прадпрыемства з месяца ў месяц мае праблемы з выплатай заработнай платы, значыць, трэба прымаць больш кардынальныя меры да кіраўнікоў».*

## КОРАТКА

• Сёння ў Мінску пройдзе пасяджэнне Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, у якім прымуць удзел Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. Таксама пройдуць двухбаковыя перагаворы прэзідэнтаў.

• **Удзельнікаў міжнароднага бронепрабегу Саюзнай дзяржавы «Дарога мужнасці» па маршруце Масква—Брэст—Масква сустрэлі ўчора ў Оршы. У складзе прабегу — 15 адзінак бронетэхнікі. Прымеркаваны ён да 77-й гадавіны пачатку Вялікай Айчыннай вайны.**



• Вільнюс з 1 ліпеня ўводзіць турыстычны падатак — 1 еўра ў суткі. Ад выплаты турыстычнага збору будуць вызвалены непаўналетнія турысты і інваліды.

• **Беларускі фільм рэжысёра Вячаслава Нікіфарава «Тум-Пабі-дум» удастоены спецпрыза журы кінафестывалю краін Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС).**

• У Мінску 22—24 чэрвеня пройдзе II чэмпіянат свету ФІДЭ па хуткіх шахматах і бліцы сярод хлопчыкаў і дзяўчынак да 8, 10, 12 гадоў.

# ХАРАСТВО КАЛЯ РОДНАЙ ХАТЫ



**Працаўніца шклозавода «Нёман», які знаходзіцца ў пасёлку Бярозаўка Лідскага раёна, Валянціна ДЗЯПІНА захапляецца кветкамі, фантазіруе са старымі побытавымі рэчамі, якія выйшлі з моды альбо аказаліся без патрэбы, стварае з іх адмысловыя кампазіцыі. На падворку сваіх бацькоў у вёсцы Купіск пад Навагрудкам Валянціна стварыла хоць і простыя, але надзіва ўтульныя кветкавы куточак з чыгункоў, на які заглядаецца кожны вясковец.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Спажывец

## ХІМЧЫСТКА І... МАСАЖ ДЛЯ ПАХУДЗЕННЯ

### Якія бытавыя паслугі развіваюцца ў вёсцы

**Амаль кожная сёмая арганізацыя бытавога абслугоўвання працуе ў сельскай мясцовасці. Ці дастаткова гэтага? Што прапануюць вяскоўцам? І ці могуць жыхары аддаленых населеных пунктаў разлічваць на прыезд цырульніка і пральні?**

За мінулы год аб'ём бытавых паслуг на Міншчыне вырас на 6,5 %. Перш за ўсё на вёсцы развіваліся СТА, паслугі чысткі падушак і коўдраў, рамонт адзення, выраб штор і пакрывалаў. Апошнім часам істотна павялічыўся попыт на мыццё дываноў.

— У кожным раённым доме быту ёсць дыспетчарскія пункты. Па кароткім нумары 167 можна пазваніць з любога населенага пункта і заказаць паслугу. За мінулы год такіх зваротаў паступіла больш за пяць тысяч. Сёлета — ужо 1300. У асноўным прасілі адрамантаваць складаную бытавую тэхніку, добраўпарадкаваць месцы пахаванняў, вырабіць і ўстанавіць агароджы, узараць прысядзібныя ўчасткі, пашыць адзенне, — расказвае **начальнік упраўлення бытавога абслугоўвання Мінскай вобласці Лілія ПУЛКО.**

СТАР. 7

■ Сацыяльны вектар

## ДАПАМОГА — ПА ЗАЯЎНЫМ ПРЫНЦЫПЕ

### Мінпрацы — аб парадку звароту па сацыяльную грашовую падтрымку



**Нядаўна на сайце Мінпрацы прайшла анлайн-канферэнцыя на тэму «Дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога». У ёй прынялі ўдзел намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК, начальнік галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Марыя ГАРБАЦЭВІЧ і начальнік аддзела арганізацыі сацыяльнай дапамогі і па справах ветэранаў галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Галіна ЛАЗАРЭНКА.**

**Сёння мы публікуем самыя цікавыя пытанні аб парадку звароту па дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу (ДАСД) і ўмовах яе аказання.**

**Сям'я можа звярнуцца па дзіцячае харчаванне толькі па месцы рэгістрацыі**

***— Якім дакументам можна пацвердзіць даходы, атрыманыя ад прадпрымальніцкай дзейнасці, для прызначэння штомесячнай сацыяльнай дапамогі?***

**Галіна Лазарэнка:**

— Даходы ад ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці ўключаюцца ў сярэднедушавы даход сям'і (грамадзяніна) на падставе звестак, што прадстаўляюцца індывідуальным прадпрымальнікам самастойна, і завераных яго подпісам.

СТАР. 7

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# Скарыстаць рэгіянальны патэнцыял

**Фарміраванне эфектыўнай рэгіянальнай палітыкі як фактар устойлівага эканамічнага росту — на такую тэму ў мінулую пятніцу ў Ашмянскім і Астравецкім раёнах прайшло чарговае пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

У пасяджэнні, якое ўзначаліў **старшыня верхняй палаты парламента Міхаіл МЯСНІКОВІЧ,** прынялі ўдзел **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр ПАПКОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ,** прадстаўнікі міністэрстваў эканомікі, сельскай гаспадаркі, фінансаў, працы і сацыяльнай абароны, старшыні Саветаў дэпутатаў Гродзенскай і Брэсцкай абласцей.

У Ашмянах удзельнікі пасяджэння азнаёміліся з патэнцыялам раёна на выставе-прэзентацыі. Асноўная ўвага тут удзяляецца інвестыцыйнай дзейнасці. Шэраг праектаў ужо завершаны. Сярод іх — будаўніцтва гасцініц, гандлёвых цэнтраў, прыдарожных кафэ, лагістычнага цэнтра і іншае. Прайшлі мадэрнізацыю сыраробны завод і мясакамбінат, што дазволіла павялічыць экспарт прадукцыі. Тут таксама плануецца рэалізаваць некалькі буйных інвестпраектаў па пашырэнні магутнасцяў прадпрыемстваў.

Добрыя напрацоўкі ў Ашмянскім раёне мае турыстычная сфера, якая развіваецца, дзякуючы кластарнаму падыходу, а таксама рэалізацыі шэрагу мясцовых ініцыятыў і культурных праектаў. Ёсць рэзерв у прыцягненні дзелавых колаў і развіцці прадпрымальніцтва, а таксама стварэнні новых працоўных месцаў.

Пытанне аб гэтым паўстала своечасова, бо ў краіне неабходна да 2025 года павысіць валавы ўнутраны прадукт (ВУП) да памеру ў 100 млрд долараў у эквіваленце. Дзякуючы гэтаму ўзровень жыцця насельніцтва пачне расці і будзе вышэй за сярэдні. Але для гэтага неабходна прыкласці намаганні, галоўным чынам на рэгіянальным узроўні: прыцягненнем інвестыцый, стварэннем новых інавацыйных прадпрыемстваў з новымі працоўнымі месцамі і гэтак далей.

— Сваіх інвестыцый недастаткова, таму трэба прыцягваць прамыя замежныя. Усе інвестыцыйныя праекты павінны быць інавацыйнымі па сваёй сутнасці: нельга ўвесь час выходзіць на сусветныя рынкі з аднымі і тымі ж таварамі, — падкрэсліў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч.

Што датычыцца работы мясцовых Саветаў, старшыня верхняй палаты парламента ўпэўнены, што ў іх дастаткова паўнамоцтваў, каб прымаць рашэнні, бо яны маюць асноўны інструмент — зацвярджаюць бюджэт.

— Сёння трэба шукаць новыя механізмы, каб рэгіёны былі зацікаўлены ў дадатковых сродках. І такую магчымасць дае менавіта стварэнне эфектыўных працоўных месцаў. Гэта адна з крыніц папаўнення мясцовых бюджэтаў: падаходны падатак, падатак на прыбытак, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

У Астраўцы асноўная ўвага ўдзялялася сацыяльнай інфраструктуры. Горад атамшчыкаў няспынна расце, толькі на будаўніцтве Беларускай АЭС працуе каля пяці тысяч чалавек. Плануецца, што да 2025 года тут будуць жыць да 22 тысяч чалавек, што ў два разы больш, чым цяпер. Таму разам з будаўніцтвам жылля тут узводзяцца школы, дзіцячыя садкі, гандлёвыя і спартыўныя аб'екты. У мікрараёне будуецца буйная бальніца, якая будзе абслугоўваць і пацыентаў з суседніх раёнаў.

Удзельнікі пасяджэння наведалі таксама будаўнічую пляцоўку АЭС і вучэбны цэнтр, дзе адлюстроўваецца ўвесь працэс работы станцыі. Тут праходзяць падрыхтоўку спецыялісты, што будуць працаваць на «атамцы», першы блок якой павінен уступіць у дзеянне ў канцы 2019 года.

Атамная станцыя — самы буйны праект рэгіёна, адзначыў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў. Разам з тым у вобласці рэалізуюцца і іншыя значныя інвестпраекты: ідзе рэканструкцыя аўтамагістралі М6, дзейнічае шэраг пасяховых прадпрыемстваў з замежным капіталам. Плануецца будаўніцтва яшчэ аднаго азотнага завода.

Напрыканцы Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што Савет Рэспублікі плануе падрыхтаваць прапановы па ўдасканальванні рэгіянальнай палітыкі:

— Мы стварылі рабочую групу, якая займаецца вывучэннем і распрацоўкай канкрэтных даручэнняў па адміністрацыйна-тэрытарыяльных пытаннях і рэгіянальнай палітыцы. Мы плануем у найбліжэйшы год падрыхтаваць даклад з прапановамі па ўдасканальванні рэгіянальнай палітыкі.

Дарэчы, фармат мерапрыемства быў азначаны як семінар-вучоба, падчас якой удзельнікі маглі выказваць свае прапановы і пункты гледжання па абмяркоўваемых пытаннях. Папярэдні ўжо прайшоў у Слаўгарадзе, што на Магілёўшчыне, наступны запланаваны ў Барысаве, удзел у ім прымуць кіраўнікі прадстаўнічай улады Мінскага і Віцебскага рэгіёнаў.

Больш падрабязна аб пытаннях, якія былі разгледжаны на паседжанні Савета, чытайце ў наступным нумары «МС».

**Вольга АНУФРЫЕВА,**
**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

■ Парламенцкі дзённік

# БЕЗ ЛІШНІХ СЛОЎ

## Для паскарэння тэмпаў эканамічнага росту трэба павышаць прадукцыйнасць

**Аб гэтым журналістам заявіў кіраўнік прадстаўніцтва Сусветнага банка ў Беларусі Алекс КРЭМЕР перад пачаткам сустрэчы з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.**

У красавіку Сусветны банк палепшыў прагноз па росце беларускай эканомікі ў 2018—2020 гадах, аднак у канцы мая Алекс Крэмер расказаў, што баіцца паўтарэння ў Беларусі эканамічнага крызісу. З чым звязаны перагляд пазіцый — аб гэтым журналісты пацікавіліся ў спецыяліста.

«Гэта проста сведчыць аб добрых і не вельмі добрых навінах адносна развіцця макраэканамічнай сітуацыі ў краіне», — заявіў Алекс Крэмер.

На яго думку, беларуская эканоміка аднаўляецца, рэцэсія завяршылася, макраэканамічная сітуацыя паступова набірае свае тэмпы і паляпшаецца. У асноўным гэта звязана з аднаўленнем эканомікі ў Расіі, павышэннем сусветных цэн на сыравінныя тавары. Не такая добрая навіна наступная: узровень знешняга доўгу Беларусі на даволі высокім узроўні і нават расце.

«Таму наш прагноз тэмпаў росту складае не больш за 3 %, і мы мала верым у тое, што яны [тэмпы] змогуць быць хутчэйшыя, чым тыя, што назіраліся да 2009 года, — падкрэсліў кіраўнік прадстаўніцтва Сусветнага банка ў Беларусі. — Для гэтага неабходна павышаць прадукцыйнасць, што ў сваю чаргу звязана з разняволеннем прыватнага бізнесу, павышэннем прыватных інвестыцый».

Алекс Крэмер нагадаў, што зараз група Сусветнага банка прыступае да рэалізацыі пяцігадовай рамачнай стратэгіі партнёрства з Беларуссю. Мэта ж сустрэчы, якая прайшла ў Палаце прадстаўнікоў, — вызначыць, якім чынам аналітычная праца групы Сусветнага банка ў галіне макраэканомікі і інвестыцый можа быць карысная для дэпутатаў.

Як адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Уладзіслаў ШЧЭПАЎ,** у планах існуе шэраг законапраектаў, звязаных з дзейнасцю Сусветнага банка, — у адукацыі, сацыяльнай сферы. «Напрыклад, Кодэкс аб адукацыі — ён абмяркоўваецца ў Палаце прадстаўнікоў. Нам, вядома, цікавыя тыя навелы, якія прапануюцца Сусветным банкам», — сказаў Уладзіслаў Шчэпаў.

Паводле яго слоў, для профільнай камісіі па эканамічнай палітыцы комплекснае даследаванне, праведзенае Сусветным банкам, з'яўляецца фундаментальнай працай, дзе адлюстравана экспертная ацэнка апошніх тэндэнцый у розных галінах эканомікі Беларусі. «Я думаю, мы нават распрацуем план агульнай дзейнасці, план правядзення мерапрыемстваў, — дадаў дэпутат. — Тым больш у найбліжэйшы час будзем абмяркоўваць заканадаўства ў галіне інвестыцый, прыватызацыі, будзем запрашаць прадстаўнікоў групы Сусветнага банка для правядзення сумесных мерапрыемстваў».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ** ■

■ Тры пытанні да ўлады

# ДРУГОЕ ДЫХАННЕ АРШАНШЧЫНЫ

**Ужо больш за год Аршанскі раён знаходзіцца пад пільнай увагай Прэзідэнта і ўрада краіны. У пытанні «перазагрузкі» рэгіёна сёння ўдзельнічаюць многія ведамствы і міністэрствы. Прычым праца вядзецца комплексна: абнаўляюць раён на ўсіх узроўнях сацыяльна-эканамічных кірункаў. Чакаецца, што ўвесь эфект працы з рэгіёнам будзе відаць ужо ў 2020 годзе. Першы намеснік старшыні Аршанскага райвыканкама Сяргей ПАЦ падрабязна расказаў, што сёння адбываецца ў раёне.**



**— Сяргей Мікалаевіч, якая работа праведзена ў прамысловым сектары раёна за год і якія тут перспектывы?**

— У праграме развіцця раёна мы распрацавалі па кожным прадпрыемстве бізнес-планы, якія ўжо ўхвалены на ўсіх узроўнях. Па некаторых з іх да 2020 года ўключна, па некаторых — на перыяд да 2022 і 2025 гадоў. Хачу падкрэсліць, што да кожнага прадпрыемства мы падыходзім індывідуальна. У нас 33 буйныя і сярэднія прампрадпрыемствы, якія фарміруюць асноўныя аб'ёмы вытворчасці.

Напрыклад, на Аршанскім ільнокамбінаце ў 2017 годзе мы завяршылі другі этап мадэрнізацыі фабрыкі па перапрацоўцы доўгага льновалакна. Зараз да 2020 года запланаваны трэці этап — мадэрнізацыя фабрыкі па перапрацоўцы кароткага валакна. Акрамя таго, мы бачым, што неабходна развіваць швейную фабрыку на базе камбіната.

На нашым інструментальным заводзе, які доўгі час знаходзіўся ў складаным становішчы, сумесна з Міністэрствам прамысловасці мы збіраемся рэалізаваць праект па мадэрнізацыі. Акрамя таго, па інструментальным заводзе мы зараз займаемся пытаннямі па стварэнні дрэваапрацоўчых інструментаў. А гэтая ніша ў нас цяпер практычна нікім не занятая.

На заводзе «Легмаш» таксама запланаваны шэраг інвестыцыйных праектаў. На яго плошчы ў 2019 годзе пачне працаваць новая вытворчасць бясшвовых стальных балонаў. Мы плануем стварыць там больш за 40 рабочых месцаў. З чэрвеня ўжо павінны прыступіць да будаўніча-мантажных работ.

Таксама па нашым малочным камбінаце мы праводзім падрыхтоўчую работу і сёлета збіраемся рэалізаваць праект з удзелам кампаніі «Савушкін прадукт». Цяпер для нашага партнёра мы выбудоўваем лагістыку з улікам іх экспартных патрэб. Чакаецца, што праект будзе рэалізаваны да канца 2019 года.

**— У раёне вядзецца работа над асаблівай эканамічнай зонай «Брэміна-Орша», якую многія сёння параўноўваюць з беларуска-кітайскім паркам «Вялікі камень». Вядома, што ёй цікавяцца нашы індыйскія партнёры. Раскажыце, на якім этапе гэты праект?**

— Так, з 2015 года ў нас рэалізуецца праект у рамках указа Прэзідэнта аб стварэнні мультымадальнага прамыслова-лагістычнага комплексу «Брэміна-Орша». Летась мы пачалі будаўніча-мантажныя работы і да канца 2018-га ўвядзём яго першую чаргу. У цэлым жа развіццё лагістыкі ў нас запланавана ўключна па 2023 год. Зараз на тэрыторыі будучага лагістычнага цэнтра вядзецца работа па ўзвядзенні складскіх памяшканняў. Знаходзіцца ён у раёне гарадскога пасёлка Балбасава, што пад Оршай.

Мы разумеем, што на сваёй тэрыторыі павінны задзейнічаць усе магчымыя віды транспарту: авіяцыю, чыгунку і аўтамабільныя дарогі. Так, мы ўжо пачалі будаўніцтва дарогі — каля 13 км ад трасы М1 да лагістычнага комплексу. Да канца 2019 года мы яе завершым. Чыгунку таксама падвядзём бліжэй да лагістычнага цэнтра, што будзе нескладана, бо яна зараз праходзіць даволі блізка ад яго. Узлётна-пасадачная паласа аэрадрома «Балбасава» зараз знаходзіцца ў рабочым стане. Аднак мы правядзём яе мадэрнізацыю, каб можна было зручна прымаць грузы.

У перспектыве плануем стварыць на тэрыторыі лагістычнага цэнтра буйны аптовы рынак, накшталт знакамітага «Чаркізаўскага».

Тут таксама будзе функцыянаваць адмысловая эканамічная зона, якая будзе падобная на тую, што зрабілі ў сумесным Беларуска-кітайскім індустрыяльным парку «Вялікі камень». Пры гэтым у «Брэміна-Орша» першапачаткова мы будзем арыентавацца на запрашэнне індыйскіх кампаній. Шэраг індыйскіх прадпрыемстваў ужо зацікаўлены ва ўваходжанні ў склад прамысловага парка. Мы разлічваем у першую чаргу на прыход высокатэхналагічнага бізнесу.

**— Як ідуць справы з падтрымкай малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў Аршанскім раёне?**

— У нас ёсць некалькі напрамкаў падтрымкі малога бізнесу. Напрыклад, сёння працуе Аршанскі філіял інкубатара малога прадпрымальніцтва. Працоўны ў рамках бізнес-інкубатара прадпрымальнікі могуць атрымліваць плошчу з магчымасцю не плаціць за яе арэнду на працягу трох гадоў. Таксама там арганізоўваюць адукацыйныя трэнінгі, семінары. Парог уваходу досыць просты: прыйсці можа любы ахвотны.

У найбліжэйшы час будзе створаны яшчэ адзін інкубатар у гарадзе-спадарожніку Барані на плошчах прадпрыемства «Тэхніка сувязі», які дасць магчымасць адкрыць свой бізнес усім ініцыятыўным маладым людзям. Мы вызначыліся па развіцці гэтага напрамку і цяпер паэтапна будзем яго рэалізоўваць.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ** ■

■ Аты-баты

# НА ВЕРНАСЦЬ НАРОДУ І РАДЗІМЕ

## Больш за 1,5 тысячы салдат у Печах прынялі вайсковую прысягу

**Пахмурнай чэрвеньскай раніцай пад Барысавам панаваў святочны настрой. З усіх канцоў Беларусі туды з'ехаліся людзі, каб пабачыць, як іх сыны, унукі, пляменнікі, браты будуць прымаць вайсковую прысягу ў 72-м аб'яднаным навучальным цэнтры ў Печах. Агулам жа словы на вернасць Радзіме прамаўлялі па краіне больш за чатыры з паловай тысячы ваеннаслужачых, прызваных на тэрміновую ваенную службу, і каля 200 рэзервістаў. За паўгадзіны да пачатку ўрачыстай цырымоніі паспяваем крыху пагутарыць з салдатамі і іх сваякамі.**



Фота прадастаўлена прэс-службай Міністэрства абароны.

— Мы прыехалі са Старых Дарог з мужам, стрыечнай сястрой і братам, — кажа маці аднаго з салдат Святлана ВАЛОДЗЬКА. — Наш Дзіма скончыў БДТУ, уладкаваўся на работу інжынерам-праграмістам, прайшло некалькі месяцаў — і яму прынеслі павестку. З войскам мы знаёмы, як гаворыцца, не па чутках — пляменнік зусім нядаўна вярнуўся дадому з арміі. Дык хай і Дзіма нясе службу з гонарам.

— Не шкадую, што трапіў сюды, — кажа Дзмітрый ВАЛОДЗЬКА. — Калектыў добры, афіцэрскі састаў — проста выдатны. Нам усё паказваюць, дапамагаюць ва ўсім. Зараз асвойваю спецыяльнасць кухара. Зусім хутка, у ліпені, пачнецца навучанне. Гатаваць я ўмею і люблю гэта рабіць з маленства. Што змянілася ўва мне за месяц, праведзены ў Печах? Перш за ўсё — стаў больш дысцыплінаваным і самастойным.

А вось у салдата з Гродна Аляксея ГАЛУЗЫ іншы жыццёвы шлях. Ён паступіў у БДУІР, вучыўся на праграміста. Але пасля першага курса перадумаў і забраў дакументы. Пасля ўладкаваўся на работу. Адтуль і трапіў у войска.

— Ужо вырашыў, што буду пасля дэмабілізацыі аднаўляцца ва ўніверсітэце, — усміхаецца Аляксей. — А войска для мяне — яшчэ і магчымасць набрацца жыццёвага досведу і перагледзець погляды на жыццё. Служба тут ідзе цікава. Самае складанае — гэта пад'ёмы а шостай гадзіне раніцы. Будучая вайсковая спецыяльнасць таксама будзе мець дачыненне да тэхнікі — буду вучыцца на радыста-сувязіста. А зараз у нас ідзе курс маладога байца. Шчыра кажучы, мне было няцяжка. Яшчэ ў 10-м класе я ездзіў у ваенна-патрыятычны лагер разам са школьнымі сябрамі, таму асвойваю вайсковую навуку не пачынаю з нуля.

З прынясеннем прысягі навабранцаў павіншаваў **міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ.**

— У салдат наперадзе самы напружаны этап — авалоданне ваеннай спецыяльнасцю. Скончыцца курс маладога байца, і новае папаўненне сядзе за парты па асобных школах. Для работы з навабранцамі ў 72-м Аб'яднаным навучальным цэнтры ўзмоцнены штат псіхолагаў. Хлопцы прыходзяць у войска і трапляюць у стрэсавую абстаноўку для свайго арганізма. Той апарат афіцэраў-камандзіраў, які сфарміраваны ў цэнтры для работы з імі, спраўляецца з задачамі і дапамагае хутчэй адаптавацца да армейскага жыцця. Для камфортнай службы ў цэнтры зроблена многае. Мы адрамантавалі казармы, адміністрацыйна-гаспадарчыя будынкі, клуб, сталовыя, месца размяшчэння тэхнікі. Працягваем усталёўваць сістэмы відэаназірання ў казармах.

Акрамя таго, у падраздзяленнях, якія дыслакуюцца ў Печах, пачалася ўстаноўка сістэм відэаназірання. Адна з іх ужо працуе ў 3-й гвардзейскай школе падрыхтоўкі спецыялістаў танкавых і артылерыйскіх падраздзяленняў. Карцінка з 64 камер, усталяваных на чатырох паверхах, выводзіцца на два вялізарныя маніторы. Аб'екты «прастрэльваюць» наскрозь усе памяшканні. Больш за тое, камеры пішуць і гук. Мікрафоны ловяць нават шэпт.

— Вось давайце паглядзім, што адбываецца ў казарме, — гаворыць **намеснік начальніка школы па ідэалагічнай рабоце гвардыі капітан Міхаіл КУМЯКОЎ.**— А цяпер уважліва глядзіце на паралельны манітор. Карцінка ў якасці FullHD дазваляе разгледзець у падрабязнасцях усё, што адбываецца ў памяшканні. Твары бачныя так, нібыта ваеннаслужачы стаіць побач з намі. Больш за тое, у камерах прадугледжана функцыя распазнавання твараў. За тэставы перыяд мы не выявілі ніводнай памылкі ідэнтыфікацыі. Запіс будзе захоўвацца на працягу месяца.

Мяркуецца, што да канца года сістэма будзе ўсталявана ва ўсім 72-м Аб'яднаным вучэбным цэнтры.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК** ■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### АЎСТРЫЯ ГАТОВАЯ ПРЫНЯЦЬ РАСІЙСКА-АМЕРЫКАНСКІ САМІТ

Аўстрыя пагадзілася прыняць саміт прэзідэнтаў Расіі і ЗША — Уладзіміра Пуціна і Дональда Трампа. Пра гэта аўстрыйскі віцэ-канцлер Хайнц-Крысціян Штрахе паведаміў у інтэрв'ю тэлеканалу «Расія 24», перадае ТАСС. Палітык заявіў, што Аўстрыя — бяспечная і нейтральная дзяржава, што дазваляе ладзіць у краіне падобныя мерапрыемствы. Паведамлялася, што магчымым месцам сустрэчы кіраўнікоў дзвюх дзяржаў стане Вена. Пуцін звярнуўся да канцлера Аўстрыі Себасцьяна Курца з просьбай арганізаваць перагаворы з амерыканскім лідарам.

### НОВЫ ПРЭЗІДЭНТ КАЛУМБІІ АБЯЦАЕ ЗАХАВАЦЬ МІРНЫЯ ДАМОВЫ З ПАЎСТАНЦАМІ

Абраны новым прэзідэнтам Калумбіі Іван Дуке пацвердзіў, што захавае заключаныя раней мірныя дамовы з паўстанцамі з Рэвалюцыйных узброеных сіл Калумбіі. «Мы не дазволім, каб мір быў разбураны», — заявіў Дуке, выступаючы ў Багаце перад тысячамі прыхільнікаў. У той жа час ён адзначыў, што мірныя дамовы будуць скарэкціраваны з тым, каб у цэнтры ўвагі апынуліся ахвяры працяглага ўзброенага канфлікту. «Мы гарантуем праўду, правасуддзе і кампенсацыі для ахвяр», — сказаў абраны прэзідэнт. З перамогай Івана Дуке павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.



### У ЯПОНІІ КОЛЬКАСЦЬ ПАЦЯРПЕЛЫХ АД ЗЕМЛЯТРУСУ ПЕРАВЫСІЛА 360 ЧАЛАВЕК



Колькасць пацярпелых падчас моцнага землятрусу на захадзе Японіі перавысіла 360, пацвярджаецца гібель чатырох чалавек, паведамляе тэлеканал NHK. Паводле яго інфармацыі, загінулымі па-ранейшаму лічацца трое, у тым ліку 9-гадовая дзяўчынка ў горадзе Такацукі. Метэаралагічная служба Японіі ўдакладніла, што магнітуда землятрусу дасягнула 6,1. Моц падземных штуршкоў склала шэсць з сямі балаў па японскай сістэме. Эпіцэнтр знаходзіўся на поўначы прэфектуры Осака. З-за стыхійнага бедства быў спынены рух на шэрагу ўчасткаў хуткасных чыгунак і на аўтатрасах на паўднёвым захадзе вострава Хонсю, былі таксама адменены заняткі амаль у 300 школах. Больш за 100 тысяч сем'яў засталіся без газу з-за землятрусу, паведаміў прэм'ер-міністр краіны Сіндза Абэ на пасяджэнні ўрада, скліканым у сувязі са стыхійным бедствам.

### ТУРЦЫЯ ХОЧА ПАБУДАВАЦЬ У АНТАРКТЫЦЫ НАВУКОВУЮ БАЗУ

Прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган заявіў, што краіна планаве да 2019 года пабудаваць у Антарктыцы навуковую базу. Пра гэта ён напісаў у сваім Twitter. Паводле слоў прэзідэнта, у Антарктыцы ўжо прысутнічаюць аб'екты трох дзясяткаў краін. Раней Турцыя не мела палярных навуковых станцый, але ў 2019 годзе сітуацыя зменіцца. «Наш час патрабуе глабальнага бачання перспектыў», — напісаў Эрдаган.

FIFA WORLD CUP RUSSIA 2018

### Пенальці пасля відэапаўтору прынёс перамогу Швецыі

Учора днём у матчы групы F каманда Швецыі перамагла зборную Паўднёвай Карэі з лікам 1:0. Гол з пенальці забіў Андрэас Гранквіст, прычым 11-метровы быў чарговы раз на гэтым чэмпіянаце прызначаны пасля прагляду суддзёй відэапаўтору моманту, на які ён адразу не звярнуў увагу. Як відаць, арбітры вельмі актыўна пачалі выкарыстоўваць нававвядзенне FIFA, і можна сказаць, што гэта моцна ўплывае на канчатковы вынік матча.

### Немцы прадэманструюць рэакцыю

Прэзідэнт Нямецкага футбольнага саюза Райнхард Грындзель напэдаў у панядзелак трэніроўку каманды ў Ватуцінках і заявіў, што ў гульнях са шведамі і карэйцамі нямецкія футбалісты прадэманструюць рэакцыю на няўдачу на старце турніру. «Матч са зборнай Мексікі не быў гульнёй, дзе ўсё стаяла на карце. Цяпер у матчах са Швецыяй і Паўднёвай Карэяй мы прадэманструем сапраўдную рэакцыю», — напісаў ён пасля трэніроўкі ў Twitter.

### Аўтамабіль за гол і прычоска Неймара

Матч зборных Ісландыі і Аргенціны, які скончыўся ўнічыю 1:1, глядзела 99,6 % насельніцтва Ісландыі, паведамляецца ў афіцыйным мікраблогу Футбольнай асацыяцыі краіны ў Twitter.

Капітану зборнай Сербіі па футболе Аляксандру Калараву падарылі паўнапрывадны пазадарожнік Lada 4x4. Адпаведны сертыфікат яму ўручыў часова в. а. губернатара Самарскай вобласці Дзмітрый Азараў. Уладаы сумесна з самарскімі балельшчыкамі вызначылі, што аўто-прыз будзе ўручаны футбалісту, які заб'е першы гол на «Самара-Арэне» ў матчах чэмпіянату.



Нападаючы зборнай Бразіліі Неймар змяніў прычоску перад стартам чэмпіянату свету па футболе. Карыстальнікі сацсетак палічылі яе падобнай на порцыю локшыны, а таксама параўналі з птушыным гняздом і ўдосталь паздзекаваліся з форварда ў інтэрнэце.

Карыстальнік Twitter Паола Джанет падзялілася відэаролікам са сваёй бабуляй і назвала яе «прычынай» перамогі зборнай Мексікі над немцамі. Гераіня роліка праз экран тэлевізара па чарзе перахрысціла ўсіх гульцоў зборнай перад пачаткам матча.

Марадона закурыў цыгару падчас матча Аргенціны супраць Ісландыі, парушыўшы тым самым забарону на курэнне на стадыёне. Пазней Дыега ў сябе ў Instagram спаслаўся на неразуменне ў час яго, папрасіў прабачэння ў балельшчыкаў і арганізатараў турніру і запрасіў усіх на гульні сваёй зборнай.

**Іван КУПАРВАС.**

■ Надвор'е

# ГАРАЧЫНЯ І АМАЛЬ БЕЗ ДАЖДЖОЎ

## У чацвер прыпячэ да 31 цяпла

**У краіне ў маі — чэрвені адзначаецца недахоп ападкаў. У апошнія дні ў некаторых рэгіёнах краіны прайшлі дажджы і сітуацыя палепшылася. Але ёсць шэраг раёнаў, дзе за перыяд з першых чысла мая выпала ападкаў менш за 25 % ад нормы, у Жлобінскім, напрыклад, за паўтара месяца — толькі 10 %, паведамляюць у Белгідрамеце.**

Не чакаецца добрых дажджоў і на гэтым тыдні. Заўтра асноўным надвор'еўтваральным фактарам у краіне будзе поле павышанага атмасфернага ціску. Чакаецца ў асноўным без ападкаў. Вецер прагназуецца заходні ўмераны, уначы па поўначы, днём у многіх раёнах парывісты. Тэмпература паветра ўдзень будзе 20—26 цяпла, па поўдні — да плюс 28 градусаў. Самым цёплым днём тыдня стане чацвер. У гэты дзень будзе пераважна без ападкаў, толькі днём у асобных раёнах на паўднёвым захадзе краіны магчымы кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні, паўднёвы ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 9—15 цяпла, а ўдзень будзе ад плюс 23 да плюс 29 градусаў, па поўдні — да 30—31 цяпла. А ў пятніцу да нас завітае халодны франтальны падзел, які будзе перамяшчацца праз нашу краіну на ўсход. Таму на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 9—16 цяпла, па паўднёвым усходзе — плюс 17—19 градусаў. Днём будзе ад плюс 17 да плюс 23 градусаў, у паўднёва-ўсходніх раёнах — плюс 24—27 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# У 21 РАЁНЕ МІНШЧЫНЫ НЕЛЬГА Ў ЛЯСЫ

**На тэрыторыі сталічнай вобласці ўсталявалася засушлівае надвор'е. У 21 раёне Мінскай вобласці (апроч Мядзельскага) уведзена забарона на наведванне лясоў.**

Ратавальнікі нагадваюць, што калі ўведзена забарона, то нельга наведваць лес наогул: ні збіраць ягады, ні заязджаць на машыне, ні праводзіць пікнікі, ні тым больш распальваць вогнішчы. За парушэнне правілаў пажарнай бяспекі або забароны на іх наведванне прадугледжана адміністрацыйная адказнасць у выглядзе штрафу да 25 базавых велічынь, калі не нанесена шкода, і ад 25 да 50 базавых велічынь, калі пашкоджаны або знішчаны лес.

**Што рабіць, калі сталі сведкам лясного пажару?**

— Адразу ж патэлефануйце па тэлефоне МНС;

— спяшайцеся пакінуць месца пажару: ідзіце насустрач ветру або перпендыкулярна беражку пажару, па прасеках, дарогах, палянах, берагах ручаёў і рэк; памятайце, што ў сухое надвор'е і пры ветры недагаркі галля, лісце, вуголле пераносяцца на дзясяткі метраў;

— пры моцным задымленні, калі ў вас ёсць такая магчымасць, прыкрыйце рот і нос мокрай анучай;

— пры верхавых лясных пажарах, калі гараць кроны дрэў, схованкам могуць служыць берагі вадаёмаў, буйныя паляны, ліставы лес без хвойніку;

— не трэба шукаць прытулак на дарогах і прасеках, акружаных хваёвым лесам, асабліва маладняком з нізка апушчанымі кронамі, а таксама ў лагах, парослых лесам.

**Сяргей РАСОЛЬКА** ■

■ Па сутнасці

# ГУЛЯЙ-ПОЛЕ АБО ПРАВАВАЯ ПРАСТОРА?

**Якія перакосы павінна ліквідаваць новая рэдакцыя закона аб СМІ**



## Фэйкавае бязмежжа да дабра не давядзе

Мабыць, ні адна заканадаўчая ініцыятыва (акрамя паправак у Канстытуцыю) не выклікала ў нашай краіне такога шырокага грамадскага рэзанансу, як цяперашні праект закона аб зменах у рабоце сродкаў масавай інфармацыі. Дыскусіі пачаліся яшчэ на стадыі распрацоўкі гэтага найважнейшага прававога дакумента. Калі ж ён быў апублікаваны, супрацьстаянне спрачальнікаў набыло яшчэ больш востры характар. Асабліва пасля таго, як праект быў прыняты парламентам у двух чытаннях.

Грамадзяне выказваюцца з гэтай нагоды ў друку, даюць інтэрв'ю на радыё і тэлебачанні, актыўна выкарыстоўваюць для адлюстравання свайго пункту гледжання інтэрнэт-рэсурсы. Не вычэрпваецца і паток адпаведных зваротаў у розныя інстанцыі.

Больш за ўсё электронных лістоў на ўзнятую тэму прыходзіць у Міністэрства інфармацыі. Пераважная большасць жыхароў краіны падтрымлівае ініцыятыву распрацоўшчыкаў новага закона. Яны згодныя з тым, што змена правілаў гульні ў медыйнай прасторы даўно наспела.

Разам з інтэрнэтам для нас адкрыліся каласальныя магчымасці ў зносінах, пошуку патрэбнай інфармацыі, ажыццяўленні фінансавых аперацый, працаўладкаванні, адукацыі, вырашэнні мноства іншых праблем. Але сусветнае сеціва разам з вялікім дабром прынесла і небывалае зло. Пад пагрозай апынуліся не толькі мова, культура, маральнасць, правапарадак, але і самі дзяржаўныя асновы. Калі зараз не зрабіць прышчэпку супраць гэтага працэсу, то праз якіх-небудзь пяць-дзесяць гадоў крычаць каравул будзе позна. Таму Міністэрства інфармацыі і выступіла ініцыятарам паправак у заканадаўства, каб утаймаваць анархію на медыйным полі.

## Маскі зняць!

Законапраект у тым ліку прадугледжвае ўвядзенне працэдуры ідэнтыфікацыі карыстальнікаў інтэрнэт-рэсурсаў. Цяпер на любым сайце пры абмеркаванні той ці іншай тэмы мы ўбачым цэлы калейдаскоп каментарыяў. Вельмі часта шакуючых. Гэта можа быць прамая абраза чалавека, паклёп на яго, адкрытая хлусня ў ацэнцы эканамічнай сітуацыі, правакацыйныя заявы ў адрас пэўнай нацыянальнасці — межаў канапнаму вальнадумству няма. Як няма і ніякіх маральных абмежаванняў у падборы лексікі аўтарамі такіх «шэдэўраў». Адказнасці яны не баяцца, бо іх ніхто не ведае.

Атмасфера ўсёдазволенасці спараджае ўсё новыя тэхналогіі маніпулявання масавай свядомасцю. Ну, напрыклад. З якой-небудзь нагоды ў сеціве раптам узнікае процьма разнастайных водгукаў. Абывацель іх чытае і нават не здагадваецца, што праглынае прынаду, якую насадзілі на кручок усяго некалькі чалавек, выступіўшы пад рознымі псеўданімамі, так званымі нікамі. Часта такой акцыяй кіруюць з агульнага цэнтра, а «крэатыўныя» выканаўцы атрымліваюць за свае «літаратурныя паслугі» жаданыя грошыкі.

Мэта падобных інфармацыйных атак розная — ад рэкламы тавараў і дыскрымінацыі канкурэнтаў да імкнення кіраваць грамадскай думкай і правакавання вулічных беспарадкаў.

Цяпер гэтай вольніцы прыходзіць канец. Па новым законе кожны, хто захоча пазабаўляць свет сваім геніяльным каментарыем, абавязаны будзе зняць маску. Праўда, пакуль не вызначана, якім менавіта спосабам павінна будзе ажыццяўляцца гэтая фармальнасць. Магчыма, з дапамогай sms-паведамлення, па якім лёгка ўстанавіць уладальніка тэлефона.

Калі разабрацца, то самаідэнтыфікацыя — гэта мера не толькі не рэпрэсіўная, але нават гуманная. Яна дапаможа аматарам правакацыйных каментарыяў пазбегнуць непрыемнасцяў. Бо многія з іх не ведаюць, што вылічыць віртуальнага плеткара для кампетэнтных органаў і цяпер не складана. Таму нават за ананімны «паток свядомасці» ў інтэрнэце можна лёгка трапіць пад суд. А вось калі творцы эпатажных замалёвак вымушаны будуць выйсці на паверхню з каламутнай багны сеткавага бязмежжа, то гэта зробіць іх больш асцярожнымі. І перш чым што-небудзь ляпнуць на ўсю іванаўскую з рызыкай у тым ліку і для саміх сябе, тысячу разоў падумаюць.

## Правілы для ўсіх адзіныя

Грамадзяне пытаюцца: чаму адны крыніцы інфармацыі, напрыклад, газеты, радыё, тэлебачанне, ва ўстаноўленым парадку зарэгістраваныя як СМІ, а іншыя, такія як большасць інтэрнэт-рэсурсаў, — не? Нягледзячы на тое, што апошнія з'яўляюцца распаўсюджвальнікамі, і вельмі эфектыўнымі, розных звестак, фота- і відэаматэрыялаў, разнастайнай літаратуры і г. д. Іх прадстаўнікі наведваюць прэс-канферэнцыі, бяруць інтэрв'ю, робяць запыты ў афіцыйныя ўстановы аб атрыманні даведак, прыцягваюць рэкламу. Словам, дзейнічаюць, як звычайныя рэдакцыі. На якой падставе? А вось так, без аніякіх падстаў і законнага дазволу. Тут у нас усё тое ж гуляй-поле: максімум свабоды і мінімум адказнасці.

Новы законапраект закліканы ліквідаваць і гэта спараджэнне інтэрнэтнай анархіі. Цяпер вэб-рэсурс будзе мець права зарэгістравацца ў якасці сеткавага выдання, чым ён па сутнасці і з'яўляецца. З атрыманнем усіх магчымасцяў, якімі валодаюць афіцыйныя СМІ. У выпадку адмовы ад рэгістрацыі любая яго дзейнасць па зборы і распаўсюджванні масавай інфармацыі будзе лічыцца незаконнай. Так што або прыйдзецца аформіць рэгістрацыю і апынуцца ў прававым полі, або назаўжды развітацца з марай абвешацца лаўрамі модных таблоідаў.

## Калі марудзіць нельга

Міністэрства інфармацыі ў некаторых выпадках мае права абмяжоўваць доступ да таго ці іншага інтэрнэт-рэсурсу без адпаведнага рашэння суда. Гэтая норма дзейнічае ўжо дастаткова даўно. І, трэба сказаць, сябе апраўдала. Аднак для некаторых яна, што называецца, як костка ў горле. І вось цяпер, калі прымаюцца дадатковыя папраўкі ў закон аб СМІ, некаму здалося, што самы час зноў у поўны голас асудзіць «таталітарныя метады» беларускай дзяржавы ў рабоце з інтэрнэт-рэсурсамі.

Думаецца, гэтыя крытыкі не бачаць ніякай розніцы паміж, скажам, напрыклад дзяльбой маёмасці, якая можа цягнуцца гадамі ў судзе, і інфармацыйным укідам, што імгненна распаўсюджваецца з дапамогай інтэрнэту сярод велізарнай колькасці карыстальнікаў.

Уявім сабе, што нейкі сайт размясціў жудаснае відэа, здольнае давесці да вар'яцтва юныя неакрэплыя душы. Мы што, будзем чакаць, пакуль збярэцца суд з усім яго працэсуальным антуражам, паважна правядзе слуханні бакоў, нетаропка прыме рашэнне? Хацелася б зірнуць на таго гуманіста-разумніка, які адкажа, што так і трэба было б зрабіць.

У нармальнай дзяржаве заўсёды павінны быць прадугледжаны спрошчаныя працэдуры рэагавання на розныя агрэсіўныя праяўленні. І гэта добра, што Міністэрства інфармацыі ў межах сваёй кампетэнцыі мае права на падобнае аператыўнае ўмяшальніцтва. Бо немагчыма дапусціць распаўсюджванне ў вольным доступе матэрыялаў, якія прапагандуюць гвалт, спажыванне наркотыкаў, заклікаюць да суіцыду, грамадскіх беспарадкаў і г. д. Зацягванне з блакіраваннем такой крыніцы па сутнасці з'яўляецца саўдзельніцтвам у злачынстве.

## Падвойнае дно «дабрачыннасці»

І апошні аспект, на якім неабходна спыніцца, абмяркоўваючы наспеўшыя змены ў заканадаўстве аб СМІ. Вострае непрыманне ў пэўным асяроддзі выклікала дапаўненне, якое забараняе замежным грамадзянам і юрыдычным асобам выступаць у нашай краіне заснавальнікамі сродкаў масавай інфармацыі.

Тут нялішне нагадаць гісторыю з праславутымі НКА (некамерцыйнымі арганізацыямі), якія ў апошнія дзесяцігоддзі пладзіліся (ды і працягваюць) па ўсім зямным шары. Нібыта з самымі высакароднымі намерамі: для рэалізацыі гуманітарных праектаў, адукацыйных праграм, сацыяльнай і медыцынскай дапамогі, развіцця спорту і іншага. На справе ж значная доля гэтых структур аказалася падсобнай гаспадаркай глабалістаў, якія любымі спосабамі імкнуцца ўплываць на кіраўніцтва дзяржаў.

Асаблівага поспеху тут дасягнуў вядомы фінансавы дзялок Джордж Сорас. Ён нават не хавае сваіх намераў па пераўладкаванні свету, шчодра аплачваючы змену палітычных рэжымаў у розных кутках планеты.

Калі ў галовах нацыянальных лідараў стала адбывацца прасвятленне наконт сапраўднай ролі некаторых «дабрачынных устаноў», то пазбавіцца ад іх аказалася не так проста. Самы свежы канфлікт падобнага роду ў цяперашні момант разыгрываецца ў Венгрыі. Нядаўна там адбыліся масавыя акцыі пратэсту пасля таго, як прэм'ер-міністр Орбан наважыўся закрыць у Будапешце фінансуемы Сорасам Цэнтральна-Еўрапейскі ўніверсітэт. На прэм'ера, які ўсё больш адкрыта імкнецца адстойваць інтарэсы свайго народа, гуртам накінуліся не толькі супрацоўнікі сорасаўскага ўтварэння. На яго, як па загадзе, напалі работнікі амерыканскага пасольства ў Венгрыі, Дзярждэпартамента ЗША і нават Венгерская акадэмія навук. Каб спыніць Орбана, да справы падключылі шэраг вядомых штатаўскіх навукоўцаў, у тым ліку нобелеўскіх лаўрэатаў. Цікава, ці ўдасца кіраўніку суверэннай еўрапейскай дзяржавы і яе парламенту, дзе цяпер разглядаецца пытанне аб далейшым лёсе ўніверсітэта, адстаяць права на самастойнае рашэнне?

Дарэчы, у Беларусі падвойнае дно многіх НКА выявілі хутка. І гэтак жа аператыўна іх прыкрылі. Цяпер спытаем сябе: калі за шырмай нявіннай канторы, якая спансуецца заморскімі кашалькамі, можа ажыццяўляцца відавочная падрыўная дзейнасць, то чаго чакаць ад газеты або інтэрнэт-выдання, заснаваных іншаземцам? Асабліва ў эпоху бязлітасных гібрыдных войнаў.

**Георгій РОС**

■ Прамыя лініі

# УЛАДА НА СУВЯЗІ

**У мінулую суботу, 16 чэрвеня, у жыхароў адразу двух абласцей нашай краіны з'явілася магчымасць задаць свае пытанні кіраўнікам мясцовай вертыкалі ўлады: на прамой сувязі з насельніцтвам знаходзіліся старшыні Брэсцкага і Гомельскага аблвыканкамаў.**

## Крэдыт для шматдзетнай сям'і і дадатковы занятак для пенсіянераў

**Падчас прамой лініі старшыні Брэсцкага аблвыканкама Анатоля ЛІСА паступіла 30 зваротаў.**

Пытанні крэдытавання будаўніцтва жылля не страчваюць актуальнасці. На гэты раз паспрыяць прасіла мама нованароджанай тройні з вёскі Завішша Іванаўскага раёна. Губернатар даручыў адпаведным службам падрабязна разабрацца ў сітуацыі і дапамагчы шматдзетнай сям'і.

А пенсіянер з Баранавіч прапанаваў пазваніў з прапановай стварыць цэх па перапрацоўцы ягад і, магчыма, агародніны. Аўтар звароту лічыць, што такое прадпрыемства азначала б стварэнне новых рабочых месцаў, а таксама дало б магчымасць пенсіянерам дадатковы зарабіць. Многія панеслі б вырашчаную на прысядзібных участках прадукцыю. Анатоль Ліс адзначыў, што прапанова мае рацыянальнае зерне, але для яе рэалізацыі патрэбны інвестар, гатовы ўкласці сродкі.

Былі і званкі-падзякі. Напрыклад, жыхары горада Высокае выказалі ўдзячнасць за работу па добраўпарадкаванні горада, між іншым пацікавіліся, ці ёсць план будаўніцтва аб'язной дарогі вакол населенага пункта. Анатоль Васілевіч пагадзіўся, што ў перспектыве такую магчымасць трэба разглядаць.

Некалькі званкоў было ад членаў садовага таварыства «Дынама», якое размешчана на мяжы Брэсцкага і Жабінкаўскага раёнаў. Дачнікі прасілі паспрыяць газіфікацыі іх пабудоў. Як паведамілі ў аддзеле па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб аблвыканкама, большасць пытанняў, якія паступілі на прамую лінію, датычыліся сферы камунальнай гаспадаркі — рамонту і абслугоўвання дамоў, добраўпарадкавання населеных пунктаў, будаўніцтва і рамонту дарог.

## Суправаджаць вырашэнне праблемы

**Сярод 22 пытанняў падчас апошняй прамой лініі ў Гомельскім аблвыканкаме не было такіх, якія можна аднесці да ліку невырашальных. Яго кіраўнік Уладзімір ДВОРНІК падкрэсліў, што ўсе праблемы можна было б рашыць і без умяшальніцтва абласной вертыкалі ўлады.**

Асноўныя тэмы, якія закранаў жыхары рэгіёна — зямельныя і маёмасныя спрэчкі, аспекты ўступлення ў спадчыну, арганізацыя гандлю, камунальна-бытавыя праблемы, стан дарог і іншыя. Трэба адзначыць, што на прамую лінію паступіла і падзяка: гамяльчанка Наталля Сакун адзначыла добрасумленнасць супрацоўнікаў і кіраўніка РЭУ № 14 Гомеля, якія нядаўна завяршылі капітальны рамонт у доме па вуліцы Валгаградскай.

Гамяльчанін Алег Панамароў па даручэнні жыхароў дома № 11 па вуліцы 60 гадоў СССР звярнуўся з пытаннем пра размеркаванне цеплавой энергіі ў гэтым доме. На першым паверсе шматпавярховіка арандуюць памяшканні пад аптэку, кавярню і краму. Тры гады грамадзяне не могуць дабіцца паасобнага ўліку спажывання цяпла для жыхароў і арандатараў. Як было адзначана падчас прамой лініі, да пачатку ацяпляльнага сезона праблема павінна вырашыцца.

Пенсіянер Вячаслаў Горбатаў скардзіўся на стан дарогі ад вёскі Хутаранка Гомельскага раёна да чыгуначнай станцыі Церуха. Ён адзначыў, што раней дарогу перыядычна грэйдзіравалі, але апошнім часам пра яе забыліся. Уладзімір Дворнік даручыў выканаць гэтыя работы да канца дня. Будзе зроблены ў хуткім часе ямкавы рамонт і каля дома № 16 па вуліцы Свірыдава ў Гомелі. — Дарэчы, на папярэднюю прамую лінію старшыні аблвыканкама таксама паступалі званкі са скаргамі на дарожнае пакрыццё. Рэакцыяй на звароты грамадзян стаў рамонт вуліц Паўлава, Новапалескай, Гагарына, Крапоткіна ў Гомелі, вуліцы Перамогі ў Ветцы і іншых. Падводзячы вынік прамой лініі, губернатар падкрэсліў:

— Важна не толькі даваць пісьмовыя тлумачэнні людзям, але і максімальна аказваць садзейнічанне і суправаджэнне ў рашэнні таго ці іншага пытання. Напрыклад, калі чалавеку трэба ўступіць у спадчыну, а грамадзянін не зусім кампетэнтны ў гэтых пытаннях, то дапамагчы напісаць заяву, узгадніць прыём натарыуса. Асабліва гэта датычыцца пажылых людзей і людзей з інваліднасцю.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, Ірына АСТАШКЕВІЧ**

# «ТРАНЖЫРЫЦЬ І КУЦІЦЬ ДАКЛАДНА НЕ БУДУ»

«Міс Беларусь — 2018» — пра мары, планы і перамены ў жыцці

**Схлушу, калі скажу, што ў дзяўчыне, з якой мы сустракаемся ў мінскай кавярні сонечным чэрвеньскім ранкам, складана пазнаць новую «Міс Беларусь» Марыю ВАСІЛЕВІЧ. Насамрэч яе часта пазнаюць на вуліцах, просяць сфатаграфавацца альбо проста праводзяць позіркам. «Напачатку мяне гэта вельмі бянтэжыла, але цяпер стараюся рэагаваць прыязна: усміхнуцца, перакінуцца парай слоў», — гаворыць яна.**
**А вось ва ўніверсітэце старасту курса хоць і павіншавалі з прыгожай перамогай, але патуранняў не рабілі — і чырвоны дыплом БДЭУ Маша атрымала на агульных падставах, што саму яе толькі радуе.**



## ЖЫЦЦЁ ПАСЛЯ КАРОНЫ

— Літаральна днямі абаранілa дыплом на 9 балаў. Праўда, больш хвалявалася на дзяржэкзамене, — прызнаецца Марыя. — Усё ж дыплом я пісала, можна лічыць, з другога курса, вяла курсавыя работы, і калі яны нарэшце «выраслі» ў выніковую, ведала тэму ўжо ледзьве не на памяць. А на дзяржэкзамене было шмат прадметаў у адным білеце, да таго ж нечакана на іспыт зазірнуў рэктар — ён прафесар на нашай кафедры, так што я распераживалася і сабралася, толькі калі пачала адказваць. Але ў выніку ўсё добра, ужо атрымалі дыпломы — вельмі прыгожая, кранальная і крыху сумная цырымонія атрымалася...

***— Але ж для вас гэта не развітанне з роднай ВНУ, вы планавалі паступіць у магістратуру. Або планы памяняліся?***

— Не, усё ў сіле. Акрамя таго, мяне чакае і рэкламная кампанія, дзе я працавала акаўнт-менеджарам, але тут я не ўпэўнена, ці атрымаецца ўсё сумясціць па часе і занятасці.



Праца ў рэкламнай сферы вельмі падабаецца, аднак хутка пачнецца шчыльная падрыхтоўка да конкурсу «Міс свету», потым трэба будзе на месяц паехаць на яго, і неяк, мне падаецца, нязручна ўвесь час адпрошвацца і падводзіць людзей. Таму, відаць, буду шукаць працу з гібкім графікам альбо частковай занятасцю, бо ведаю дакладна, што проста сядзець дома і па вечарах хадзіць у магістратуру мне будзе сумна.

***— Я так разумею, з загрузкай і абавязкамі «Міс Беларусь» не тое, каб проста сядзець дома, і часу не будзе. Наогул, удалося нармальна адпачыць?***

— Ну, тыдзень адсыпацца ніхто не даў, былі там недзе прамежкі ў палову дня, — смяецца Маша. — Вось мінулыя выхадныя сабе вызваліла, каб з'ездзіць да сваякоў і пахрысціць пляменніка, — гэта такая ўзрушальная і адказная справа... А так пакрысе, памалу прыходжу ў сябе. Гэтым летам яшчэ, спадзяюся, дазволю сабе канікулы.

***— Адзін з галоўных прызоў — белы пазадарожнік «Джылі Атлас» — вы ўжо атрымалі. Як пачуваецеся за рулём?***

— Здарова! Гэта мая першая машына: правы я атрымала ў 19 гадоў, але дагэтуль не кіравала, так што перапынак атрымаўся даволі вялікі. Першы тыдзень ездзіла з братам ці татам, якія ацэньвалі маё кіраванне і ў прынцыпе пахвалілі. Цяпер проста атрымліваю задавальненне і, напэўна, як кожны, у каго з'явілася першая машына, стараюся ездзіць часцей куды-небудзь: хоць па справах, хоць з мамай у краму.

***— У канцы мая вы збіраліся сустрэцца з дзяўчатамі — выпускніцамі праекта «Міс Беларусь»...***

— Убачыцца ўсім, натуральна, не атрымалася — усё ж сабраць 30 чалавек з усіх рэгіёнаў даволі складана. На апошнім званку сустракаліся і адпачывалі разам з дзяўчатамі, якія ўвайшлі ў топ-10, яшчэ плануем 3 ліпеня сабрацца.

***— Інтрыга пра тое, ці вольнае ваша сэрца, пратрымалася зусім нядоўга...***

— Журналісты раскруцілі на прызнанне, што хлопца ў мяне няма, таму ўвагі з боку супрацьлеглага полу стала вельмі многа. Канешне, гэта прыемна, але пакуль што я з усімі кантактую толькі па-сяброўску.

***— Дарэчы, пра сяброў: ці ўсе яны прайшлі выпрабаванне «меднымі трубамі» і здолелі шчыра парадавацца за вашу перамогу?***

— Усе, каго я лічыла блізкімі сябрамі, такімі і засталіся, пацвердзілі шчырасць нашых адносін, і гэта вельмі важна для мяне. Што да эмоцый малазнаёмых людзей, то нейкі негатыў ад іх мяне мала хвалюе.

*Але ж няма тое хусты, каб завязаць людзям вусны, і новую «Міс Беларусь», як чалавека публічнага, часта абмяркоўваюць у інтэрнэтпрасторы. Самая забаўная чутка, якая ходзіць пра Машу, — як быццам яна дачка аднаго з топ-10 беларускіх бізнесменаў. «Улічваючы, што я з простай сям'і: мама працуе памочнікам выхавальніка ў садку, тата быў вайсковец, цяпер працуе таксістам, — мы толькі пасмяяліся з гэтага «праверанага сведчання», — не крыўдуе дзяўчына на свецкіх плеткароў.*

## НЕ ДЛЯ ПТУШАЧКІ

Марыя яшчэ не атрымала грашовы прыз, які складае каля 12 000 беларускіх рублёў, але ўжо займаецца дабрачыннасцю. Так, у Дзень абароны дзяцей яна завезла падарункі ў сталічны дзіцячы дом № 5. «Былі ўласныя накапленні, і я змагла выдаткаваць на гэта пэўную суму, — паціскае плячыма Марыя з такім выглядам, як быццам проста выйшла ў краму па хлеб. — Шчыра кажучы, мела накот дзетдомаўцаў некаторыя стэрэатыпы і сустрэчы чакала з пэўнай насцярогай: як там дзеці да мяне паставяцца, якія яны наогул — мо і непатрэбны ім мае падарункі? Але атрымала такі шчыры, цёплы прыём, што на ўсе свае страхі забылася: так ужо радасна беглі да мяне абдымацца і маленькія, і старэйшыя дзеці. Хіба зусім дарослыя хлопцы, якім па 17—18 гадоў, сядзелі далёка, паводзілі сябе стрымана і толькі падышлі сфатаграфавацца, а ўсе астатнія відавочна ўсцешыліся... Нават не ведаю, хто больш задавальнення атрымаў: яны ад падарункаў або я ад іх усмешак і радасці».

***— На мой погляд, вялікі плюс, што гэта было не шумнае, не пратакольнае мерапрыемства, а ўласная добрая воля...***

— Насамрэч многія часта пытаюцца: «Дзе прапісана, што вы павінны займацца дабрачыннасцю?». А хто тут прымусіць, калі гэта павінна ісці ад сэрца? Я і раней займалася дабрачыннасцю — патроху, як магла, а цяпер тытул проста дазволіць рабіць гэта з большым маштабам. І калі ў тым ліку з дапамогай СМІ ўдасца прыцягнуць увагу да канкрэтных людзей і адрасоў, нагадаць кожнаму, што ён можа дапамагчы ў меру сваіх магчымасцяў, хай нават дробяззю, — гэта важна.

*Прадбачу пытанне шаноўнай публікі: дык што ўсё ж будзе з грашыма, якія выйграла «Міс Беларусь»? Марыя адказвае шчыра, што не любіць з незабітага ляса футра шыць, таму канкрэтныя планы пабудуе, калі атрымае грошы на рукі: «Выдаткаваць іх можна часткова на дабрачыннасць, часткова на ўласную адукацыю, а яшчэ на падрыхтоўку да «Міс свету», дзе спатрэбяцца розныя ўборы, касметыка, шмат чаго яшчэ... Транжырыць і куціць дакладна не буду, гэта не пра мяне».*

*Конкурс «Міс свету» пройдзе ў Кітаі толькі ў снежні, але час мінае хутка і спецыялісты Нацыянальнай школы прыгажосці ўжо распачалі падрыхтоўку. Марыя, са свайго боку, вывучае інфармацыю пра ход шоу, уважліва слухае рэкамендацыі былых удзельніц — напрыклад першай «Міс Беларусь — 1998» Святланы Крук, і ўжо задумваецца, як будзе ўдзельнічаць, напрыклад, у спаборніцтве талентаў:*

— Думаю, гэта будуць танцы. Я даволі доўга імі займалася, спрабавала практычна ўсе стылі, ад эстрадных да сучасных, уключаючы хіп-хоп і кантэмпарары дэнс, зрабіла перапынак толькі ў апошнія два гады, але тэхніка засталася, і калі як след падрыхтавацца, з дапамогай прафесіяналаў, мяркую, можна прыдумаць і адрэпеціраваць цікавае выступленне... Наогул, я лічу, да любой справы варта як след падрыхтавацца, каб зразумець, што цябе чакае, а не прыязджаць з карабля на баль.

***— Незалежна ад вынікаў конкурсу «Міс свету», куды думаеце рухацца далей: рэкламная сфера або тэлевізійная, мадэльны бізнес ці яшчэ нешта?***

— Перш за ўсё хачу скончыць магістратуру, атрымаць поўную вышэйшую адукацыю па сваёй спецыяльнасці «менеджар-эканаміст»



і дыплом, які будзе каціравацца ў тым ліку і за мяжой. Буду ўдасканальваць англійскую мову, якая дакладна спатрэбіцца і на «Міс свету», і ў працы, і наогул у жыцці. Магчыма, у будучыні таксама паспрабую рэалізаваць даўнюю мару стаць тэлевядучай. Праўда, усе журналісты ў адзін голас кажуць, што для гэтага журфак не патрэбны, а патрэбная прафесійная школа або курсы тэлевізійнага майстэрства, а потым — кастынгі і пошук свайго кірунку.

## ПРА САВЁ, ДЗЯВОЧАЕ

***— Дзяўчаты не даруюць, калі я пра гэта не спытаю. Цудоўны вонкавы выгляд — гэта добрая генетыка і здаровы лад жыцця альбо ўсё ж дыеты, пэўныя абмежаванні?***

— Я не ставіла б генетыку на першае месца, інакш можна псіхалагічна загрузіцца і, калі ў цябе блізкія — мама, бабуля — з лішняй вагой, паставіць на сабе крыж. Лічу, што правільнае харчаванне і спорт у любым выпадку дапамогуць выглядаць лепей — утрымліваць вагу, мець чыстую скуру, быць у тонусе і гэтак далей. Сама я, напэўна, на фоне стрэсу і напружанага конкурснага рэжыму скінула некалькі кіло і пакуль што не вельмі камфортна адчуваю сябе, але спадзяюся неўзабаве вярнуцца ў норму. Не скажу, што для гэтага патрэбна штосьці асаблівае, — як і ўсе, я часам люблю смачна паесці, напрыклад у перыяд доўгіх навагодніх свят. Але на конкурсе нам падабралі правільны, збалансаваны рацыён. І калі першыя два дні было складана, то сёння я ўжо і сама не магу вярнуцца да тлустай ежы або ўжываць мучное — праўда, днямі вось з'ела булачку ва ўніверсітэце, — смяецца Марыя. — Дзяўчаты, калі вы хочаце палепшыць форму, то карэктуйце свой рацыён і пацюху, без фанатызму, павялічвайце фізічныя нагрузкі. Трэба перацярпець, прывучыць арганізм да перамен, і вынікі будуць хай і не самыя хуткія, затое трывалыя.

***— Што параіце юным беларускам, якія паспрабуюць свае сілы на наступным конкурсе «Міс Беларусь»?***

— Не раўняцца на іншых, не прыпадабняцца, верыць у свае сілы і мець унутраны стрыжань. А яшчэ неабходна разумець, што конкурс ужо даўно не толькі пра прыгажосць, але і пра ўнутранае напаўненне, што тытул — гэта не толькі ўзнагарода, але і адказнасць, пэўная місія. І каб быць яе вартай, трэба звярнуць увагу як на дэфіле, так і на чытанне кніг, як на заняткі спортам, так і на інтэлектуальнае самаразвіццё.





**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ і з архіва гераіні.**

### Бліц для каралевы

***— Якую музыку зробіце гучней?***

— Не магу вылучыць аднаго выканаўцу. У машыне заўжды іграе радыё «Рэлакс» — ціхая, спакойная музыка, для трэніровак выбіраю драйвовую, пад настрой слухаю класіку.

***— Кніга ці аўтар, да якіх любіце вяртацца?***

— «Майстар і Маргарыта». Як і ўсе, прачытала твор у школе, але лічу, што гэта было зарана і «даспела» я пазней. А цяпер штораз, перачытваючы, знаходжу новыя сэнсы. Яшчэ сярод любімых аўтараў Дастаеўскі, а з замежнікаў — Рэмарк, ягоную «Іскру жыцця» я праглынула за суткі.

***— Калі актыўны лад жыцця, то...***

— Бег. З дзяцінства бегаю па лесе з татам, які не толькі расказаў, што такое марш-кідок на 15 км у поўнай выкладцы, але і прывіў сапраўдную любоў да бегу. І калі раней я даганяла, то цяпер ужо тата вымушаны падцягвацца пад мой тэмп.

***— Самае зручнае для вас адзенне...***

— Класічнага стылю, жаноцкае: сукенкі, абцасы і г. д. У 18 гадоў я саромелася свайго росту, а потым, працуючы мадэллю, убачыла, што высокія дзяўчаты на абцасах — гэта прыгожа і эфектна.

***— Першае, на што звяртаеце ўвагу пры знаёмстве з новым чалавекам?***

— Напэўна, на ўсмешку. Я сама ўсмешлівая, і калі чалавек усміхаецца ў адказ, то выклікае большую прыязнасць, чым надта ўжо сур'ёзны суразмоўнік.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Крупское райпо (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже следующих объектов недвижимого имущества:

Лот № 1: **здание столовой** общей площадью **231,4 кв. м**, инв. № 613/С-13744, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623055700001000811 (предоставлен на праве аренды) площадью **0,0543 га**, по адресу: Минская область, Крупский район, **г. п. Бобр, ул. Базарная, 3**.

На земельном участке имеются ограничения: водоохранная зона рек и водоемов (0,0543 га), охранная зона электрических сетей (0,0142 га).

Начальная цена с НДС (20 %) – **9 600,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 960,00 бел. руб.).

**Лот № 2: доля в праве 43/100 в магазине «Ветеран»** общей площадью **284 кв. м (доля составляет 117,5 кв. м)**, инв. № 613/С-325, расположенном на земельном участке с кадастровым номером 623050100001000059 (предоставлен на праве постоянного пользования) площадью **0,0640 га**, по адресу: Минская область, **г. Крупки, ул. Зайцева, 5**.

Начальная цена с НДС (20 %) – **36 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 3600,00 бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с №BY48BAPB30153214700100000000** БИК BAPBBY2X в ЦБУ № 525 г. Крупки, региональная дирекция по Минской области ОАО «Белагропромбанк» ул. Советская, 10, УНН 600093961 ОКПО 01796656.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 3 (трех) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Аукцион состоится 13.07.2018 г. в 16.00 по адресу: Минская область, г. Крупки, ул. Ленина, 7. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.07.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: 801796 54-936, 555-67**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

| Извещение о проведении повторного аукциона | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», г. Слуцк, пл. Базарная, 13. | | |
| **Предмет аукциона** (одним лотом) | | | |
| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер | Адрес (номер дома) |
| **Месторасположение предмета аукциона:** Минская обл., Слуцкий р-н, **г. Слуцк**, ул. Максима Богдановича | | | |
| **Здание кирпичное** | 40,4 кв. м | 640/С-84557 | д. 136А/1 |
| **Здание склада** | 286 кв. м | 640/С-84559 | д. 136А/2 |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,1009 га, предоставлен продавцу на праве аренды сроком по 10.01.2033 г. для содержания и обслуживания зданий. Ограничения прав: водоохранная зона реки Случь, площадь 0,1009 га | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 36 416,00 бел. руб.** | | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | |
| Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 12.05.2018 г. | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **09.07.2018** в 11.30 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **05.07.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** | | |

## Проведение вторых повторных торгов по продаже имущества НП ОДО «Фундаменты»

| № лота | Наименование лота | Начальная цена, руб. (без НДС) | Сумма задатка, руб. | Шаг торгов 5 %, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль грузовой (бетоносмеситель) «МАЗ 5337А2» ABS-5-01, Y3M5337A280000934, 2008 г. в. | 4 560,00 | 456,00 | 228,00 |

Цена указана без НДС. (УСН)

Торги в электронной форме (далее – торги) будут проведены на электронной торговой площадке WWW.TORGI24.BY:

начало – 6 июля 2018 г. в 9.00, окончание – 6 июля 2018 г. в 17.00.

**Письменная заявка на участие в торгах и копия документа, свидетельствующего об оплате задатка, подается по 04.07.2018 на адрес электронной почты организатора торгов: torgi24@tut.by.**

Задаток на участие по каждому лоту составляет 10 % от его начальной цены и должен быть перечислен по **04.07.2018** на расчетный счет организатора торгов – ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Корженевского, 14, оф. 404, УНП 191514793, р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код (BIC) UNBSBY2X. Назначение платежа: задаток по лоту (наименование лота и его номер) для участия в электронных торгах **06.07.2018.**

Организатор торгов: **ООО «Расантехторг»,** тел. +375 (29) 670-30-84.

Продавец: **НП ОДО «Фундаменты»,** в лице управляющего ООО «БизнесУэй», тел.+375 (29) 165-33-65.

Местонахождение лота: **Логойский р-н, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 38.**

Лицо, ответственное за хранение имущества: **ООО «Расантехторг»,** тел. +375 (29) 670-30-84.

Ознакомиться с лотами можно в будние дни с 09.00 до 17.00 по месту нахождения лота, предварительно согласовав время прибытия.

Правила и порядок проведения торгов, оформление участия в электронных торгах указаны на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве www.bankrot.gov.by и на сайте **WWW.TORGI24.BY**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении повторных торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Агросервис»**

| | |
|---|---|
| Лот № 1. **Капитальное строение с инв. № 700/С-73858 – АЗС,** площадь – 23,7 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пер. Урожайный, 1Г. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание АЗС с мощением асфальтобетонным (пл. 12 265 кв.м), ограждением железобетонные плиты на железобетонных столбах. Сведения о земельном участке: лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 740100000007005725, площадью – 1,4785 га. Емкость объемом 5 куб. м с инв. № 924; емкость объемом 5 куб. м с инв. № 925; емкость объемом 9 куб. м с инв. № 923; емкость объемом 20 куб. м с инв. № 929; емкость объемом 20 куб. м с инв. № 982; емкость объемом 20 куб. м с инв. № 927; емкость объемом 20 куб. м с инв. № 928. ***Начальная цена продажи: 78 069,49 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка – 7 806,95 бел. руб.*** | |
| **Продавец** | ОАО «Агросервис», УНП 700010487, г. Могилев, ш. Славгородское, 44а |
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, МФО BIC банка BPSBBY2X |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 5 июля 2018 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 4 июля 2018 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | Победитель аукциона обязан в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи. Оплата производится на условиях заключенного договора купли-продажи |
| **Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 12.04.2018 и 31.05.2018** | |

Участник, выигравший торги, уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в соответствии со счет-фактурой, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (+375 222) 72-41-14, +375 29 624-26-25, +375 44 738-18-99, Mogilev@ino.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г.Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.

| |
|---|
| **Продавец:** ОАО «Витрайбыт», 211341, Витебская обл., Витебский р-н, аг. Вороны, ул. Ленинская, 36А, тел. +375 29 893-55-81 |
| Лот №1. Капитальное строение с инв. № 200/С-90744 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Туловский с/с, аг. Тулово, ул. Центральная, д. 11А, площадью 467,6 кв. м, наименование: административное здание, назначение: здание административно-хозяйственное, расположенное на земельном участке с кадастровым № 221288503601000617 площадью 0,1099 га. Нач. цена: 31 200 бел. руб. с учетом НДС. Задаток: 3 120 бел. руб. Обременение: договора аренды сроком до 05.04.2020, 25.05.2019, 22.08.2019, 24.05.2019 |
| Аукцион состоится 20.07.2018 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 19.06.2018 с 8.30 по 19.07.2018 до 17.30. **Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, BIC MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Срок заключения договора купли-продажи: 10 календарных дней со дня проведения аукциона. Условие аукциона: оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, затраты по оценке имущества, государственной регистрации и изготовлению технического паспорта |

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

## Изменения в проектной декларации ООО «ДАТЧ СТАР», опубликованной в газете «Звязда» 06.09.2016 г. № 171

Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (I очередь строительства, 6–11 секции, II очередь строительства, секции 1-3) (I очередь строительства, 3-й пусковой комплекс, 4-й пусковой комплекс).

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

«стоимость 1 кв. м жилого помещения для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, на момент опубликования изменений проектной декларации по договорам создания объекта долевого строительства: для **3 (трех)** однокомнатных квартир площадью от **38,66 до 46,17 кв. м** составляет от 1000 до 1500 долларов США оплата производится в бел. руб. по курсу доллара НБ на дату оплаты и **3 (трех**) трехкомнатных квартир площадью от **82,06 до 84,34 кв. м** составляет от 1000 до 1350 долларов США оплата производиться в бел. руб. по курсу доллара НБ на дату оплаты.

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения».

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского д. 19, пом. 860.

Тел.: +375 44 53 43 000, +375 29 53 43 000.

УНП 191061436

## Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении 24 июля 2018 г. аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества в рамках 235-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды объекта (руб.) | Целевое использование имущества | Сумма задатка (руб.) | Характеристика имущества и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский,** тел.: +375 (17) 225-61-21, +375 (17) 225-69-77 | | | | | | | |
| *1* | г. Минск, пл. Привокзальная, 5 | 462,8 | 694,2 БАВ | 1 863,93 | Под размещение зала игровых автоматов (детских) и (или) бильярдного зала, размещение игровой комнаты для детей дошкольного возраста с воспитателем, размещение офиса, организацию розничной торговли продовольственной группой товаров и (или) непродовольственной группой товаров (кроме товаров, бывших в употреблении и товаров ритуального назначения), под объект общественного питания | 186,30 | Площадь расположена в главном корпусе Северного железнодорожного вокзала (на отметке +12,750 на 4-м этаже). Имеются: центральное отопление (в период отопительного сезона), естественное освещение, охранно-пожарная сигнализация и видеонаблюдение (включены в общую систему вокзального комплекса), санузел. На указанной площади находятся: гардероб, кладовая, зал (площадью 383,7 кв. м). Имеется отдельный вход на 4-м этаже вокзала. Необходимость ремонта отсутствует. В ТЦ «Галилео» имеется платная парковка. **Срок аренды – 3 года.** |

БАВ – базовая арендная величина с 01.04.2018 составляет 16,11 рублей.

**Договор аренды заключается сроком на 3 года.**

**Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.**

Аукцион состоится **24 июля 2018 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Возможность **осмотра имущества**, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, **обеспечивает арендодатель**.

**Организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнять у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), а также размер коммунальных платежей.**

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства.

Участвовать в аукционе могут юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе:**

– уплачивает задаток (юридические лица и индивидуальные предприниматели оплату производят **платежным поручением**!) по соответствующему предмету торгов (назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 235 от 24.07.2018 по предмету аукциона № ______**), перечисляемый на расчетный счет № BY34BPSB30121049710199330000 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, государственное предприятие «МГЦН» (сумма задатка по каждому предмету торгов указана в соответствующей графе таблицы). **Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов;**

– подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов (бланк заявления можно получить у организатора аукциона);

***юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:***

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:***

легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копии **платежного поручения** либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***индивидуальный предприниматель:***

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***физическое лицо*** – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

– заключает с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения:

физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность;

представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** и консультации по вопросам участия в аукционе **осуществляются с 21 июня 2018 г. по 18 июля 2018 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.**

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.**

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

*При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

**Порядок определения победителя аукциона:**

– торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

– аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 100 (сто) базовых величин на дату проведения аукциона.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить **на текущий (расчетный) счет арендодателя** сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. **Информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона**.

***Важно!*** *Договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом). Заключение договора аренды, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.*

**Договора аренды имущества должны быть заключены в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.**

**Телефоны для справок:** **отдел аукционов** + 375 (17) 327 40 22, **отдел аренды** + 375 (17) 327 41 70, **бухгалтерия** + 375 (17) 328 36 58. **Интернет:** **www.mgcn.by**

# ДАПАМОГА — ПА ЗАЯЎНЫМ ПРЫНЦЫПЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— У выпадку звароту па ДАСД у выглядзе штомесячнай сацыяльнай дапамогі сям'і з непаўналетнімі дзецьмі, у якой бацька доўгі час не працаваў, ці будуць у сярэднедушавым даходзе ўлічвацца ўмоўныя аліменты за гэты час (фактычныя прыбыткі бацькі маюцца толькі за два месяцы)?***

**Марыя Гарбацэвіч:**

— Парадак уліку аліментаў у сярэднедушавым даходзе сям'і пры вызначэнні яе права на ДАСД у выглядзе штомесячнай (аднаразовай) сацыяльнай дапамогі, забеспячэння прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця вызначаны п. 14 Палажэння аб парадку ўліку даходаў і разліку сярэднедушавога даходу сям'і (грамадзяніна) для аказання ДАСД, зацверджанага пастановай Саўміна ад 28 сакавіка 2012 г. № 274.

У згаданай сітуацыі ўмоўныя аліменты не будуць улічвацца. Пры гэтым раённай камісіяй па аказанні ДАСД можа быць прынята рашэнне аб аказанні сям'і штомесячнай сацыяльнай дапамогі на няпоўны перыяд з распрацоўкай плана па паляпшэнні матэрыяльнага становішча сям'і.

***— Нашай сям'і прызначана штомесячная сацыяльная дапамога на два месяцы і складзены план па паляпшэнні матэрыяльнага становішча. Падкажыце, ці змагу я паўторна звярнуцца па штомесячную сацыяльную дапамогу, калі план не будзе з якіх-небудзь прычын выкананы?***

**Аляксандр Румак:**

— Рашэнне аб перыядзе аказання штомесячнай сацыяльнай дапамогі прымаецца раённай камісіяй з улікам прымаемых сям'ёй мер па паляпшэнні матэрыяльнага становішча. Пры гэтым пры неабходнасці камісіяй распрацоўваюцца мерапрыемствы па паляпшэнні матэрыяльнага становішча і вызначаюцца тэрміны іх выканання. У выпадку невыканання такіх мерапрыемстваў з суб'ектыўных прычын пры паўторным звароце сям'я страчвае права на атрыманне штомесячнай сацыяльнай дапамогі.

***— У нас у сям'і нарадзіліся двайняты. У бальніцы нам сказалі, што мы можам звярнуцца па дзяржаўную падтрымку на прадукты харчавання для двойні. Падкажыце, якімі прадуктамі харчавання будуць забяспечвацца дзеці? Ці зможам мы атрымліваць імпартныя сумесі?***

**Марыя Гарбацэвіч:**

— Сем'ям пры нараджэнні і выхаванні двайнят і больш дзяцей ДАСД у выглядзе забеспячэння прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця аказваецца безадносна ўзроўню даходу. Пры гэтым яна аказваецца ў натуральнай форме на кожныя шэсць месяцаў да дасягнення дзіцем узросту двух гадоў. Выдаюцца толькі прадукты айчыннай вытворчасці.

Такая дапамога аказваецца на падставе рэкамендацый доктара-педыятра па рацыёне харчавання дзіцяці ў адпаведнасці з яго станам здароўя і з улікам прыкладных месячных набораў прадуктаў харчавання для дзяцей ранняга ўзросту, зацверджаных пастановай Мінпрацы і сацабароны і Міністэрствам аховы здароўя.

***— Ці мае права сям'я звяртацца па дзіцячае харчаванне па месцы фактычнага пражывання без афармлення часовай прапіскі?***

**Галіна Лазарэнка:**

— Парадак звароту па ДАСД у выглядзе забеспячэння прадуктамі харчавання ўстаноўлены п. 31 Палажэння аб парадку аказання дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі, зацверджанага Указам Прэзідэнта ад 19 студзеня 2012 года № 41. Згодна з гэтым пунктам, заява падаецца адным з бацькоў у орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў адпаведнасці з рэгістрацыяй па месцы жыхарства або месцы знаходжання. Пры гэтым асноўнай умовай аказання сям'і такога віду дапамогі па месцы яе рэгістрацыі з'яўляецца фактычнае пражыванне дзіцяці па месцы жыхарства (месцы знаходжання) бацькоў.

Адпаведна, зварот па названы від дапамогі магчымы толькі па месцы пастаяннай або часовай рэгістрацыі.

### Сэнс дапамогі для пакрыцця выдаткаў на набыццё падгузкаў — дапамагчы інваліду, а не яго сваякам

***— Па сацыяльную дапамогу для пакрыцця выдаткаў на набыццё падгузкаў могуць звяртацца члены сям'і інваліда І групы. Якія дакументы могуць быць прадстаўлены членам сям'і для пацвярджэння сваіх паўнамоцтваў у дачыненні да інваліда І групы?***

**Галіна Лазарэнка:**

— Дакументамі, якія пацвярджаюць сваяцтва ў адносінах, могуць быць пасведчанне аб нараджэнні, пасведчанне аб заключэнні шлюбу, пасведчанне аб усынаўленні (удачарэнні) ці копія (выпіска з) рашэння суда аб усынаўленні (удачарэнні) і іншыя.

***— Я звярнулася па штомесячную сацыяльную дапамогу і падала даведку аб зарплаце, атрыманай за год. Праз некалькі дзён я атрымала з упраўлення сацыяльнай абароны апавяшчэнне, што прадстаўлены мной звесткі аб заработнай плаце будуць правераны. Ці правамерна гэта?***

**Аляксандр Румак:**

— У адпаведнасці з п. 37 Палажэння аб парадку аказання дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі, зацверджанага Указам Прэзідэнта ад 19 студзеня 2012 года № 41, орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне мае права правяраць звесткі, названыя ў заяве аб аказанні ДАСД, і таксама размешчаныя ў прадстаўленых заяўнікам дакументах.

Пры правядзенні такой праверкі заяўніку на працягу трох рабочых дзён з дня прыёму заявы паведамляецца аб неабходнасці здаданай праверкі. Таксама яму паведамляецца, што рашэнне камісіі будзе прымацца на працягу пяці рабочых дзён пасля атрымання апошняга адказу на запыт, звязаны з праверкай звестак.

***— У маі гэтага года майму бацьку ўстанавілі І групу інваліднасці і выдалі медыцынскае заключэнне, што ён мае патрэбу ў падгузках. Але падгузкі мы набываем даўно. Падкажыце, за які перыяд мы можам прадстаўляць чэкі, якія пацвярджаюць набыццё падгузкаў, для іх аплаты?***

**Марыя Гарбацэвіч:**

— Паколькі сацыяльная дапамога для пакрыцця выдаткаў на набыццё падгузкаў аказваецца на падставе індывідуальнай праграмы рэабілітацыі інваліда або заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі, то для яе прызначэння грамадзянам неабходна прадстаўляць дакументы, якія пацвярджаюць выдаткі на набыццё падгузкаў, з даты выдачы такіх медыцынскіх дакументаў аб патрэбнасці ў падгузках.

***— Чаму з заявай на атрыманне дапамогі на падгузкі могуць звяртацца сваякі інваліда І групы, а ў выпадку смерці інваліда І групы дапамога ім не выплачваецца?***

**Марыя Гарбацэвіч:**

— Падаць заяву аб аказанні ДАСД у выглядзе сацыяльнай дапамогі для пакрыцця выдаткаў на набыццё падгузкаў і неабходныя дакументы сваякамі інваліда І групы стала магчыма з 1 ліпеня 2017 года. Пры гэтым названая сацыяльная дапамога аказваецца інваліду І групы, а не яго законнаму прадстаўніку або сваяку.

У адпаведнасці з арт. 1090 Грамадзянскага кодэкса выплаце падлягаюць назначаныя грамадзяніну, але не атрыманыя ім пры жыцці з якой-небудзь прычыны, сумы заработнай платы і прыраўнаваныя да яе плацяжы, пенсіі, дапамогі па сацыяльным страхаванні, іншыя дапамогі і плацяжы для пакрыцця шкоды жыццю або здароўю. Выплата (плацяжы) у выглядзе ДАСД ва ўказаным артыкуле адсутнічае.

У сувязі з гэтым у выпадку смерці грамадзяніна, які меў права на сацыяльную дапамогу для кампенсацыі выдаткаў на набыццё падгузкаў, выплата такой дапамогі сваякам не ажыццяўляецца.

***— Ці можна атрымаць штомесячную дапамогу за 2016 год? З 2016 года я з'яўляюся інвалідам ІІ групы, а дапамогу атрымала толькі ў 2017 годзе.***

**Галіна Лазарэнка:**

— Зварот па ДАСД носіць заяўны характар і ажыццяўляецца шляхам падачы заявы ўстаноўленай формы і дакументаў, неабходных для назначэння дапамогі. Рашэнне аб аказанні (або аб адмове ў аказанні) ДАСД прымаецца раённай камісіяй на падставе прадстаўленых дакументаў ва ўстаноўленыя заканадаўствам тэрміны.

Калі вы не звярталіся з адпаведнай заявай і неабходнымі дакументамі ў орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, падставы для аказання вам ДАСД у выглядзе штомесячнай сацыяльнай дапамогі за 2016 год адсутнічаюць.

Падрыхтавала **Святлана БУСЬКО.**

# ХІМЧЫСТКА І... МАСАЖ ДЛЯ ПАХУДЗЕННЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яна дадае, што развіваюцца тыя паслугі, якія запатрабаваны. Важна, каб дзейнасць была рэнтабельнай. З цікавага — нядаўна ў Нясвіжскім раёне адкрыўся вакуумна-ролікавы масаж для карэкцыі фігуры.

Канкрэтным прыкладам работы з насельніцтвам падзялілася **дырэктар Салігорскага раённага камбіната бытавога абслугоўвання Марыя ЖЫЛІЧ:**

— У нас адкрыты наступныя падраздзяленні: чатыры майстэрні па рамонце абутку і чатыры — па пашыве адзення, тры цырульні, чатыры фотаатэлье, адзін пункт пракату, пяць салонаў рытуальных паслуг, пральні і сучасная хімчыстка. Апошняя аказвае шмат паслуг: афарбоўка, чыстка дублёнак, скуры, замшы, велюру, пуха-пер'евых вырабаў. Працуем над вывучэннем новых тэхналогій і іх укараненнем.

Са 157 бытавых паслуг, якія ёсць у рэестры, салігорскі камбінат аказвае 41. Штогод стараюцца пашыраць гэты пералік. Летась, напрыклад, абсталявалі дзіцячую залу цырульні, асвоілі пярманентны макіяж, прапанавалі пашыў пасцельнай бялізны для дзяцей. На будучыню хочуць адналвіць у Доме быту ламбард (раней ён прыносіў нядрэнную выручку) і адкрыць участак па пашыве вырабаў з футра.

— Практычна ўся сетка аб'ектаў бытавога абслугоўвання ў сельскай мясцовасці захавана, — адзначае Марыя Жыліч. — Хачу сказаць, што нашаму прадпрыемству яна была перададзена ў разбураным стане. Мы аднаўлялі яе практычна з нуля за ўласныя сродкі. Пабудавалі пяць комплексных прыёмных пунктаў, шэсць — капітальна адрамантавалі. На сёння ўся сетка прыведзена ў нармальны выгляд.

За студзень — май у краіне было адкрыта 911 новых аб'ектаў, якія аказваюць бытавыя паслугі, 43 працэнты з якіх — у раённых цэнтрах і сельскай мясцовасці. Больш за ўсё аб'ектаў на вёсцы з'явілася ў Гродзенскай і Мінскай абласцях. Каб забяспечыць сацыяльны стандарт у аддаленых пунктах, ёсць выязное абслугоўванне па графіку ці заяўцы.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Начальнік упраўлення сацыяльнай сферы і паслуг Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Валяр'ян БЯСПАЛЫ** спадзяецца, што ў галіну прыйдзе працаваць больш прыватнікаў. Ён нагадаў, што заканадаўствам былі ўведзены пэўныя паслабленні. Так, Дэкрэт № 7 прадугледжвае кардынальнае змяненне механізма ўзаемадзеяння дзяржаўных органаў і бізнесу. Дакумент мінімізуе ўмяшанне службовых асоб у работу суб'ектаў гаспадарання, узмацняе механізмы самарэгулявання бізнесу. Уведзены паведамляльны парадак здзяйснення распаўсюджаных відаў эканамічнай дзейнасці, у ліку якіх і аказанне бытавых паслуг.

**У сельскай мясцовасці сярод аб'ектаў бытавых паслуг пераважаюць цырульні (10,8 % ад агульнай колькасці), пункты пракату (9,6 %), майстэрні па рамонце і пашыве адзення і тэкстыльных вырабаў (9,4 %), пральні (8,2 %), майстэрні па рамонце і пашыве абутку і вырабаў са скуры (8,1 %).**

**Калі глядзець па рэгіёнах, то карцінка можа адрозніваццца. Так, у Мінскай вобласці з бытавых паслуг найбольш развіваецца тэхнічнае абслугоўванне і рамонт транспарту (36,4 %). Папулярныя таксама цырульні (10,7 %) і рамонт і вытворчасць мэблі (7,6 %).**

— Для старту дастаткова падаць адзінае паведамленне, і на наступны дзень можна займацца заяўленай дзейнасцю. Па інфармацыі аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама па стане на 1 чэрвеня ў рамках рэалізацыі нормаў Дэкрэта № 7 пададзена 1891 паведамленне аб пачатку аказання бытавых паслуг. Гэтым прынцыпам скарысталіся 160 суб'ектаў гаспадарання, — канстатуе Валяр'ян Бяспалы.

Указ № 345, які дзейнічае да канца 2022 года, дае магчымасць устанаўліваць на асобных тэрыторыях асаблівы рэжым падаткаабкладання. Індывідуальным прадпрымальнікам даецца права плаціць падатак на прыбытак у памеры шасці працэнтаў ці адзіны падатак у памеры адной базавай велічыні. Спісы населеных пунктаў, дзе прымяняюцца спрошчаныя ўмовы, зацверджаны рашэннямі абласных Саветаў дэпутатаў. У іх уключана каля 15 тысяч сельскіх населеных пунктаў па краіне, якія ахопліваюць больш за мільён чалавек (ці 20 працэнтаў вясковага насельніцтва), а таксама 66 малых гарадскіх паселішчаў. На гэтай тэрыторыі прадугледжана таксама вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць, на нерухомасць, ад зямельнага падатку і арэнднай платы за зямельны ўчастак, які знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў
ФАРПОСТ СПАКОЮ



# ГАЙДА НА ФУТБОЛ!

## Як замежным балельшчыкам трапіць на чэмпіянат

**У Расіі стартаваў чэмпіянат свету па футболе — 2018. Сапраўдныя фанаты прыехалі падтрымаць свае каманды з самых першых матчаў. Але зразумела, што чым бліжэй да фіналу, тым больш масавы інтарэс будзе выклікаць гэтая маштабная спартыўная падзея. А гэта значыць, што асаблівую ўвагу неабходна ўдзяляць грамадскай бяспецы. Дарэчы, закранае чэмпіянат не толькі расійскіх праваахоўнікаў, але і прадстаўнікоў беларускай міліцыі. Пра тое, як непасрэдна, — чытайце ў нашым матэрыяле.**

### Узаемная падтрымка

У канцы мая паміж Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай Беларусь было падпісана міжурадавае пагадненне аб узаемным прызнанні віз. Яго дзеянне распаўсюджваецца на час правядзення сёлетняга чэмпіянату свету па футболе і II Еўрапейскіх гульняў, якія пройдуць у Мінску наступным летам. Што датычыцца футбольнага спаборніцтва, то пагадненне дае права балельшчыкам, у якіх ёсць расійская віза, перамяшчацца па тэрыторыі Беларусі па бязвізе. Адпаведна, у наступным годзе расійскі бок дасць магчымасць бязвізавага праезду і знаходжання на сваёй тэрыторыі замежным гасцям, якія будуць накіроўвацца ў Мінск на II Еўрапейскія гульні.

Сёлета бязвізавы рэжым дзейнічае ў перыяд з 4 чэрвеня па 25 ліпеня. Для камфорту балельшчыкаў яго тэрміны ўключаюць у сябе 10 дзён да і 10 дзён пасля самой спартыўнай падзеі. Як расказаў **начальнік дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Беларусі Аляксей БЯГУН**, білеты на матчы купілі больш за 1,5 мільёна замежнікаў і чакаецца, што каля 10 % з іх праедуць праз нашу дзяржаву. Цалкам магчыма, значная частка з гэтых 150 тысяч чалавек захоча затрымацца на тэрыторыі Беларусі, каб лепш пазнаёміцца з культурай і побытам краіны. У гэты перыяд праваахоўныя органы робяць усё, каб гарантаваць бяспеку і камфортныя ўмовы знаходжання гасцей чэмпіянату ў рэспубліцы.

Таксама падраздзяленні транспартнай міліцыі і паліцыі будуць узаемадзейнічаць пры суправаджэнні груп балельшчыкаў па тэрыторыі Беларусі чыгуначным транспартам, пры знаходжанні і ўездзе фанатаў у Расію і іх транзітным праездзе праз нашу краіну ў Калінінград, дзе таксама адбудуцца футбольныя матчы.

### Што неабходна?

Важна ўлічыць, што скарыстацца магчымасцямі бязвізу можна толькі пры наяўнасці дзейнага дакумента, які сведчыць асобу, а таксама пашпарта балельшчыка. У дэпартаменце па грамадзянстве і міграцыі МУС Беларусі растлумачылі, што пашпарт балельшчыка, або FAN ID, — персаніфікаваная картка гледача, якая з'яўляецца часткай сістэмы ідэнтыфікацыі футбольных балельшчыкаў і выдаецца




ў мэтах камфортнага і бяспечнага знаходжання гледачоў на стадыёнах.

Такую картку павінен атрымаць кожны глядач, які набыў білеты на футбольныя матчы, а таксама члены яго сям'і ці іншыя асобы, якія накіроўваюцца разам з ім у Расію. Для гэтага трэба запоўніць анкету на сайце www.fan-id.ru або прайсці працэдуру рэгістрацыі ў Цэнтры выдачы пашпарта балельшчыка. Пашпарт з'яўляецца імянным, выдаецца бясплатна адзін раз на кожнага гледача на папяровым носьбіце, а таксама ў электроннай форме. Прад'яўляць яго можна і ў адным, і ў другім выглядзе. У выпадку страты дакумента для выезду за мяжу неабходна звярнуцца ў дыпламатычнае прадстаўніцтва або консульскую ўстанову для атрымання пасведчання на вяртанне, пасля чаго аформіць у міграцыйнай службе выязную візу. Пры страце FAN ID на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі трэба звярнуцца ў цэнтр іх выдачы ў гарадах правядзення матчаў для атрымання дубліката. Дарэчы, усяго іх 11: Валгаград, Екацярынбург, Казань, Калінінград, Масква, Ніжні Ноўгарад, Растоў-на-Доне, Самара, Санкт-Пецярбург, Саранск і Сочы.

Не ўсе звяртаюць увагу, але пашпарт балельшчыка дае права шматразовага ўезду на тэрыторыю Беларусі і Расійскай Федэрацыі ў перыяд дзеяння бязвізавага рэжыму. Апошні раз паспець уехаць трэба да 23 гадзін 59 хвілін 15 ліпеня 2018 года, выехаць можна да таго ж часу 25 ліпеня.

Таксама для ўезду ў Рэспубліку Беларусь замежныя грамадзяне абавязаны мець дагавор медыцынскага страхавання, заключаны з беларускай або замежнай страхавой арганізацыяй. Адсутнасць названага дакумента можа з'яўляцца падставай для адмовы ва ўездзе ў Беларусь.

### Не забыцца аб рэгістрацыі

Пры перасячэнні Дзяржаўнай граніцы Беларусі з мэтай далейшага руху ў Расію неабходна звярнуцца да прадстаўніка пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь для атрымання міграцыйнай карткі. Атрымліваць яшчэ адну міграцыйную картку ўжо ў Расіі не трэба. Яна павінна заставацца ў замежніка на працягу ўсяго тэрміну знаходжання ў краіне. У выпадку яе пашкоджання або страты неабходна звярнуцца ў падраздзяленне па пытаннях міграцыі тэрытарыяльнага органа МУС Расіі для атрымання дубліката.

Замежнікі, якія вырашылі затрымацца ў Беларусі, абавязаны на працягу пяці сутак, за выключэннем нядзель, дзяржаўных свят і святочных дзён, зарэгістравацца ў органе рэгістрацыі па месцы фактычнага часовага знаходжання, калі іншае не вызначана заканадаўствам і міжнароднымі дагаворамі Беларусі. Замежнікі, якія афармілі пражыванне ў гасцініцах, санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях, рэгіструюцца гэтымі ўстановамі.

На тэрыторыі Расіі замежныя балельшчыкі таксама павінны зарэгістравацца ў тэрытарыяльным органе Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай Федэрацыі або шматфункцыянальным цэнтры аказання дзяржаўных і муніцыпальных паслуг. На беларускіх балельшчыкаў гэтае правіла распаўсюджваецца толькі калі яны збіраюцца правесці ў Расіі больш за 30 дзён.

Міністэрства ўнутраных спраў звяртае ўвагу, што пропуск замежнікаў, якія едуць на чэмпіянат свету з Рэспублікі Беларусь у Расійскую Федэрацыю і назад, будзе ажыццяўляцца толькі па трох аўтамабільных і трох чыгуначных шляхах, а таксама авіятранспартам.

**Пералік шляхоў аўтамабільных зносін**

| Рэспубліка Беларусь | Участак шляху аўтамабільных зносін | Расійская Федэрацыя |
|---|---|---|
| Віцебская вобласць | Рэдзькі — Красная Горка (М-1 Мінск — Масква) | Смаленская вобласць |
| | Езярышча — Невель (Р-23 Кіеў — Санкт-Пецярбург) | Пскоўская вобласць |
| Гомельская вобласць | Селішча — Навазыбкаў (А-240 Гомель — Бранск) | Бранская вобласць |

**Пералік шляхоў чыгуначных зносін**

| Рэспубліка Беларусь | Участак шляху аўтамабільных зносін | Расійская Федэрацыя |
|---|---|---|
| Віцебская вобласць | Езярышча — Невель (Віцебск — Пскоў) | Пскоўская вобласць |
| | Асінаўка — Краснае (Мінск — Смаленск) | Смаленская вобласць |
| Гомельская вобласць | Закапыцце — Злынка (Гомель — Бранск) | Бранская вобласць |

■ Тэма

# БЫЦЬ ПРЫКМЕТНЫМ

## Каб велярух стаў масавым

**Цёплая пара года настройвае на вылазкі на прыроду і ўвогуле доўгае знаходжанне на свежым паветры. У якасці сродку перамяшчэння актыўныя беларусы ўсё часцей пачынаюць выбіраць веласіпед. Прычым гэта датычыцца не толькі вольнага часу, нярэдка веласіпед становіцца экалагічнай альтэрнатывай гарадскому транспарту. Каб дакладна рэгуляваць гэтую сферу, у студзені бягучага года была прынята канцэпцыя развіцця веласіпеднага руху ў Беларусі, асаблівая ўвага ў якой удзяляецца тэме бяспекі.**

Зразумела, безумоўным лідарам па колькасці веласіпедыстаў у краіне з'яўляецца сталіца. Па даных ГА «Мінскае веласіпеднае таварыства», у мінулым сезоне ў карыстанні мінчан знаходзілася каля 800 тысяч веласіпедаў. Пры гэтым каля 8 % дарослых гараджан летам ездзяць на іх практычна штодня, а 40 % — некалькі разоў на месяц. На жаль, пакуль усяго 1 % жыхароў сталіцы выкарыстоўвае гэта сродак перамяшчэння ў якасці асноўнага. Для параўнання: зараз сярэдні паказчык у гарадах Еўропы — 8 %. Прычын гэтаму некалькі. Адна з іх — недастаткова развітая інфраструктура, над паляпшэннем якой зараз вядзецца актыўная работа.

Наогул веласіпед здольны вырашыць мноства пытанняў, якія непазбежна ўзнікаюць у вялікіх гарадах. Па-першае, гэта даступная фізічная нагрузка для тых, хто ўвесь дзень праводзіць у офісе, па-другое, замена аўтамабіля веласіпедам дапаможа знізіць трафік, вызваліць паркоўвачныя месцы ў дварах і добрым чынам паўплываць на экалогію. Каб дасягнуць гэтага, ахопліваецца цэлы комплекс напрамкаў, якія ўключаюць у сябе інжынерныя работы, мерапрыемствы па папулярызацыі гэтага віду транспарту і прафілактыцы бяспекі яго выкарыстання, у тым ліку сярод дзяцей, удасканаленне існуючага заканадаўства ў сферы рэгулявання дарожнага руху. Плануецца, што дзякуючы гэтаму да 2030 года ў гарадах з колькасцю насельніцтва 50 тысяч чалавек і больш доля выкарыстання велатранспарту павінна падвысіцца да 8—10 %; з меншай колькасцю і ў пасёлках гарадскога тыпу — да 15—20 %; у аграгарадках і сельскіх населеных пунктах — да больш 40 %. Для гэтага мясцовым органам улады неабходна распрацаваць планы рэалізацыі канцэпцыі з канкрэтным спісам мерапрыемстваў у залежнасці ад спецыфікі рэгіёна.

Супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі падкрэсліваюць: ні ў якім разе нельга забываць, што веласіпедыст — паўнавартасны ўдзельнік дарожнага руху. А гэта значыць, што ён таксама абавязаны выконваць ПДД, парушэнне якіх вядзе да адказнасці. Адны з асноўных камянёў спатыкнення — спешыванне на пешаходных пераходах, дзе неабходна, а таксама выкарыстанне святлоадбівальных элементаў у цёмны час сутак пры руху ўздоўж дарог.

Як расказаў **часова выконваючы абавязкі па пасадзе начальніка аддзела арганізацыі дарожнага руху і дарожнай інспекцыі УДАІ МУС Беларусі Аляксандр ХРОМЧАНКА**, на працягу апошніх дзесяці гадоў назіраецца тэндэнцыя ўстойлівага зніжэння агульнай колькасці ДТЗ з удзелам веласіпедыстаў, а таксама колькасці загінулых. Калі дзесяць гадоў таму гінула каля 150—160 веласіпедыстаў штогод, то летась сумная статыстыка спынілася на 42 асобах. Самым небяспечным па-ранейшаму застаецца рух уздоўж рэспубліканскіх дарог, дзе высокі хуткасны рэжым. Што датычыцца ДТЗ у цёмны час сутак, то з 21 выпадку са смяротным вынікам 20 адбылося там, дзе адсутнічала штучнае асвятленне. Таму трэба абавязкова абазначаць сябе ліхтарамі і святлоадбівальнымі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

элементамі. У ідэале — надзяваць светлазваротную камізэльку, бо менавіта яна забяспечвае найбольшы ўзровень прыкметнасці.

Вяртаючыся да руху ў гарадах: на шчасце, нягледзячы на істотны рост агульнай колькасці велатранспарту, атрымліваецца пазбегнуць узрастання аварыйнасці. Так, у мінулым і пазамінулым гадах колькасць асоб, якія пацярпелі ў выніку кантакту веласіпеда з аўтамабілем, склала 25 чалавек. Як тлумачыць **намеснік начальніка УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Андрэй ЗЫРАНАЎ**, ДАІ прымае непасрэдны ўдзел у працы над развіццём інфраструктуры. Так, на ўсіх святлафорных аб'ектах, якія павінны з'явіцца ў гэтым годзе, будуць арганізаваны велапераезды, пазначаныя зялёнай фарбай. Таксама па горадзе будуць усталёўвацца поручні пры пад'ездзе да праезнай часткі, каб веласіпедыстам не давадзілася лішні раз спешвацца. «Мы зацікаўлены, каб рух актыўна развіваўся, таму са свайго боку стараемся рабіць для гэтага ўсё магчымае», — адзначыў Андрэй Зыранаў.

Зараз у працы знаходзіцца эксперыментальны праект — выдзеленая на праезнай частцы паласа для веласіпедаў. Як кажуць спецыялісты, трэба ўлічыць шмат нюансаў, таму справа прасоўваецца не так хутка. Да таго ж выбраны няпросты ўчастак — вуліца Веры Харужай, дзе і так вельмі інтэнсіўны рух. Аднак велаінфраструктура там проста неабходная. На дадзены момант сталічным веласіпедыстам даступныя 27-кіламетровая магістральная веладарожка, дзве прагулачныя веладарожкі ў Лошыцкім парку і парку 900-годдзя Мінска, а таксама 188 кіламетраў сумешчаных пешаходна-веласіпедных дарожак ■

■ А вы ведалі, што...

# «ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ» ЧАЛАВЕЧАЙ ХІТРАСЦІ

## Якія канфіскаваныя прадметы можна знайсці ў музеі міліцыі

**У папярэдніх выпусках «Фарпоста спакою» мы ўжо расказвалі пра Музей Міністэрства ўнутраных спраў. Але цяпер падабраліся, мабыць, да самай цікавай яго часткі — гісторыі суверэннай Беларусі. Чаму яна здаецца самай захапляльнай? Адказ просты: бо мае непасрэднае дачыненне да ўсіх нас. Што ж, пачнем экскурсію.**

### Калі віртуальны свет становіцца рэальным

Сёння ў краіне распрацоўваецца сістэма маніторынгу грамадскай бяспекі.

Яе элементамі з'яўляюцца сістэмы відэаназірання за станам грамадскай бяспекі, лакальныя сістэмы відэаназірання, спецыяльныя дэтэктары (датчыкі дыму, полымя, выбуховых, наркатычных і радыеактыўных рэчываў, цеплавізары і іншае), каналы сувязі адзінай рэспубліканскай сеткі перадачы даных, праграмная платформа сістэмы маніторынгу. Наяўнасць сістэмы, якая аб'ядноўвае камеры і спецыяльныя дэтэктары па ўсёй краіне, дазволіць у разы павялічыць магчымасці адпаведных структур па гарантаванні грамадскай бяспекі і аператыўным рэагаванні на розныя негатыўныя прыродныя з'явы.

У адной з залаў музея прадстаўлена карцінка з рэальных камер, усталяваных у цэнтры сталіцы і абласных гарадоў. Наведвальнікі могуць асабіста пераканацца ў добрай якасці выявы і ў тым, што без праблем можна разгледзець патрэбныя дэталі. Адзіны момант, што трансляцыя адбываецца не ў рэжыме рэальнага часу — гэта даныя для ўнутранага карыстання ведамства: на экраны выводзяцца нядаўнія запісы.

— Мы прывыклі бачыць моладзь у тэлефонах і камп'ютарных гульнях. Але на пачатку 90-х забаў было не так шмат, таму матывы сучасных камп'ютарных гульняў маладыя людзі нярэдка ўзнаўлялі ўжывую. Адзін з самых распаўсюджаных сюжэтаў — масавыя бойкі: школа на школу, раён на раён, горад на вёску... Колькасць удзельнікаў даходзіла да 300 чалавек, — расказвае падчас экскурсіі **дырэктар Музея Міністэрства ўнутраных спраў Віялета САЛОДКАЯ**.

Доказы таго, што ў той час юнакі занадта «загульваліся», — зброя, дарэчная хіба што ў баевіках: на стэндзе і арматура з прыварынымі шыпамі, і булава з укручанымі ў яе дэталямі ад буцаў, і нават кідальныя зоркі — сюрыкены. Як жартуюць наведвальнікі: чым не доказ рэальнасці існавання чарапашак-ніндзя?

Але, здаецца, у Беларусі бывалі не толькі вядомыя чарапашкі, але нават марсіяне. Так, у музейнай экспазіцыі можна ўбачыць дакументы на імя Артура Аганэсавіча Луны, дзе ў графе нацыянальнасць стаіць «марсіянін». Увогуле пашпартоў у яго было шмат, сярод іх сустракаліся і не менш экзатычныя прозвішчы, напрыклад Петрасян або Шышкіян. Мужчына з'яўляўся злодзеем-рэцыдывістам, але на тэрыторыі Беларусі нічога скрасці не паспеў: яго затрымалі ў Брэсце за падробку дакументаў і дэпартавалі на радзіму. На жаль, ёй аказаўся не Марс, а Прыморскі край.

Асобны стэнд у музеі прысвечаны значнай даце ў гісторыі беларускай міліцыі — яе 100-гадоваму юбілею, які адзначылі 4 сакавіка 2017 года. Тут сабрана ўсё, што было выпушчана да гэтай падзеі, у тым ліку і пры дапамозе супрацоўнікаў музея. У прыватнасці, другі том кнігі пра гісторыю беларускай міліцыі быў створаны цалкам на аснове матэрыялаў з фондаў музея. Першы ж быў напісаны прафесарска-выкладчыцкім складам Акадэміі МУС. Двухтомнік стаў пераможцам конкурсу «Мастацтва кнігі — 2017». Напярэдадні юбілею таксама быў праведзены маштабны конкурс на самыя лепшыя празаічны, паэтычны і музычны творы, карціну, фотаздымак, прысвечаныя працы праваахоўных органаў. У выніку выдавецтвам «Мастацкая літаратура» быў выпушчаны зборнік найлепшых твораў, якія былі перададзеныя на конкурс. А таксама быў складзены музычны дыск «100 песень аб міліцыі». Акрамя таго, сумесна з РУП «Белпошта» да юбілею быў выпушчаны паштовы блок. Адзін дзень, 21 лютага 2017 года, абсалютна ўся пошта, якая выходзіла з Галоўпаштамта па краіне і свеце, гасілася штампам, на якім было напісана «100-годдзе міліцыі Беларусі». Гэта так званы штамп першага дня.

### Падман зроку

Ад урачыстай часткі пераходзім да паўсядзённай працы. Так, у музеі ёсць прылада, якая можа істотна палегчыць жыццё ўсім тым, хто пакутуе на непамятлівасць. Тут прадстаўлены дзверы, якія можна адмыкнуць толькі з дапамогай адбітка пальца. Два ў адным: і пра забытыя ключы больш не давядзецца перажываць, і ўзровень бяспекі жылля або офіса істотна падвысіцца.

Стэнд з прадметамі, якія канфіскавалі супрацоўнікі дэпартамента выканання пакаранняў, заслугоўвае асобнай увагі. Чаго толькі не прыдумляюць «народныя ўмельцы». Мабільны тэлефон «са смакам» кетчупа або масла, а далей, схаваны ў іх упакоўку, — чаму не. Але, мабыць, самы экзатычны экспанат тут — кактус. Ён стаяў у адной з выхаваўчых калоній. Супрацоўнік дэпартамента заўважыў, што за ім дрэнна даглядаюць — зямля высахла. Калі ён узяў расліну ў рукі, аказалася, што кактус выраблены з хлеба, іголкі — з лёскі, а ўнутры гаршка схаваны мабільны тэлефон. Нават пры бліжэйшым разглядзе далёка не адразу зразумееш, што гэта падробка. Таксама за раслінамі ў 2011 годзе спрабавалі выдаць партыю з 27,7 кілаграма гераіну. У легкавым аўтамабілі яе перавозілі пад выглядам цыбулі. Балазе, супрацоўнікам упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі добра вядомыя калі не ўсе канкрэтныя спосабы транспарціроўкі забароненых рэчываў, то ход думак злачынцаў.

Таксама ў музеі можна ўбачыць калекцыю канфіскаванай зброі. Сярод яе, напрыклад, самаробны зусім маленечкі пісталет, які страляе скарочанымі патронамі. Забіць чалавека ім немагчыма, але, калі стрэл прыйдзецца на адчувальныя ўчасткі, ён пагражае непрыемным раненнем. Ёсць у запасе музейшчыкаў і «прафесійныя прылады» злодзеяў-«мядзведнікаў». Для параўнання прапануюць паглядзець вялікіх памераў чамадан, з дапамогай якога ў 70-я было здзейснена 27 крадзяжоў на тэрыторыі Мінска і Мінскай вобласці, і невялікі набор адмычак, які змяшчаецца ў кішэні, нядаўна заказаны на адным вядомым сайце, дзе, здаецца, можна знайсці ўсё.





### «У інтарэсах» спажыўца

Адзін з відаў злачынстваў, які з'явіўся зусім нядаўна, — устаноўка на банкаматы так званых скімераў — прылад, якія счытваюць інфармацыю з карткі. Калі яна міжнароднага ўзору, атрымаць даныя праз інтэрнэт і вырабіць копію можна практычна ў любой краіне свету.

Ёсць у экспазіцыі і больш старая тэхніка. Напрыклад, прылада, з дапамогай якой у 1980-я гады складалі фотаробат, называецца яна «Партрэт». Каталог варыянтаў вачэй, вуснаў, прычосак і гэтак далей проста велізарны. Кожны ўзор быў на асобнай пласцінцы, з якіх уручную і складалі выяву.

Далей у экспазіцыі «хатняя» тэхніка. Напрыклад, прылада, выкарыстоўваючы якую закаркавалі 12 тысяч бутэлек алкаголю. Мінізавод знаходзіўся ў Фрунзенскім раёне сталіцы. Усё было аўтаматызавана: закаркоўванне, разліў, наклейка этыкетак. Крыху далей узор яшчэ адной вытворчасці — злачынная група з трох пакаленняў сям'і падраблялa алкаголь: мама з бабуляй са спірту, разведзенага з гарбатай, гатавалі «каньяк», а непаўналетняя ўнучка потым яго прадавала. Побач яшчэ адзін тавар, які з'яўляецца зусім не тым, чым здаецца, — антысептычны сродак на справе аказаўся чыстай вадой з-пад крана, у якую для ўтварэння пены дадалі шампунь.

Былі падобныя выпадкі і на буйных прадпрыемствах. Напрыклад, група зламыснікаў у пачкі беларускай мукі найвышэйшага гатунку засыпала расійскую бессартавую. Розніца — тры кошты. Маркіроўка пакетаў змяшчала і новыя даныя аб вытворцу, фасоўцы і тэрміне захоўвання мукі. На фабрыку пачалі паступаць скаргі на якасць мукі, і злачынства неўзабаве было раскрыта. Вытворца быў вымушаны замяніць упакоўку, і некалькі гадоў на ёй, каб пазбегнуць паўтарэння сітуацыі, нават размяшчалі галаграмы.

Можна ўбачыць у музеі і падробленае золата. У 90-я быў распаўсюджаны такі тып махлярства: на трасах спынялі машыны і прасілі кіроўцаў дапамагчы грашыма, маўляў, нічога не пашкадую — вось табе нават золата ў падзяку. На самай справе ўпрыгажэнні былі латуневымі. Прадстаўлены тут і класічны прыклад падману ў гандлі: гіра намінальнай вагой два кілаграмы рэальна важыць на 150 грамаў меней. Канфіскавалі яе ў жанчыны, якая гандлявала рыбай. У гіры прароблены адтуліны, якія запоўнілі больш лёгкім металам. «Выйгрыш» прадаўшчыца забірала сабе ў кішэню.

Ну і вядома, у гэтай тэме нельга пакінуць па-за ўвагай падробку дакументаў і грошай. Напрыклад, друкарскі станок для афсетнага друку вырабляў усё, што пажадаеце: акцызы, пасведчанні кіроўцы, ветпашпарты, дыпломы ВНУ і нават купюры ў 10 долараў. Працаваў ён няспынна, пакуль вынаходнікі схемы не апынуліся ў турме.

### Дакладна да мэты

Хлопчыкаў у музеі звычайна больш за ўсё ўражваюць форма і ўзбраенне, якія сёння выкарыстоўвае спецпадраздзяленне па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз». Тут жа — самаробныя выбуховыя прылады, якія даводзілася размініраваць супрацоўнікам. Вынаходлівасці насельніцтва, на жаль, накіраванай не ў тое рэчышча, праходзячы па залах увогуле не стамляешся шчыра здзіўляцца. Як і прафесіяналізму супрацоўнікаў міліцыі, якія з гэтым змагаюцца.

Наступная частка экспазіцыі прысвечана ўпраўленню па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй. Тут прадстаўлена справа сумна вядомай групоўкі Марозава, якая дзейнічала ў 90-х — пачатку 2000-х у Гомелі і Гомельскай вобласці. На лаву падсудных трапіла 48 яе ўдзельнікаў, 5 абвешчаны ў міждзяржаўны вышук, увогуле яны атрымалі каля 500 гадоў пазбаўлення волі. У ліку іх злачынстваў — 19 даказаных забойстваў, спіс астатняга не паддаецца падліку: бандытызм, разбоі, рабаванне, вымаганне, махлярства, захопы заложнікаў, згвалтаванні і іншыя эпізоды здзяснення і маёмасных злачынстваў. У іх быў канфіскаваны велізарны арсенал зброі. У музеі знаходзіцца толькі невялікая частка. Напрыклад, самаробны арбалет, якім карыстаўся адзін з блізкіх паплечнікаў Марозава па мянушцы Джын. Арбалет заводскага вырабу з аптычным прыцэлам. Сёння з такім ходзяць на паляванне на буйнога звера.

Завяршае агляд экспазіцыі экскурсавод рэальнай гісторыяй, якая ўжо стала легендарнай. У 1994 годзе супрацоўнік МУС Князеў быў адпраўлены ў ЗША працаваць пад прыкрыццём па выхадцах з Савецкага Саюза. У яго было два пасведчанні: МУС Беларусі і паліцыі ЗША. Неўзабаве пасля яго прыезду прыйшла інфармацыя, што ў аэрапорце Мінск-2 пасажыр заплаціў за білеты фальшывымі доларамі. Князеў з дапамогай паліцыі ЗША ўстанавіў месцажыхарства гэтага чалавека. Толькі ўбачыўшы Князева, той сказаў, што нават пытанні задаваць не трэба, ён і сам усё раскажа. Аказалася, што яны з супрацоўнікам міліцыі ляцелі адным рэйсам і злачынец вырашыў, што праваахоўніка з Беларусі даслалі адмыслова па яго. Падчас разбораў высветлілася, што долары ён купіў у Тэль-Авіве, адрас не змог успомніць, але намаляваў карту. Беларуская міліцыя перадала інфармацыю ізраільскім калегам, у выніку чаго была затрыманая група фальшываманетчыкаў.

Ужо падчас размовы сам-насам Віялета Салодкая прызнаецца, што пасля рэканструкцыі ў музея міліцыі сапраўды пачалося новае жыццё: «На шчасце, нашы суайчыннікі пачалі праяўляць больш цікавасці да сваёй культуры, гісторыі свайго народа і дзяржавы. Таму зараз у нас няма наведвальнікаў. Акрамя непасрэдна экскурсій мы праводзім на базе музея выхаваўчую і навучальную работу з дзецьмі і падлеткамі. Уручаем шаўроны навучэнцам прававых класаў і пагоны — кадэтам. Сумесна з ДАІ ладзім прафілактычныя гурткі і кінапаказы. Вядома, усё гэта суправаджаецца тэматычнымі экскурсіямі. Самае прыемнае для нас, што ў тых, хто праходзіць па залах, можна заўважыць шчыры агеньчык у вачах. Наведайцеся да нас — не пашкадуеце». ■



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я КАСКО.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-28168 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – магазин), общей площадью 97,2 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Подлабенский с/с, д. Беляны, д. 64

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 422080402101000015, площадь 0,0746 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли), расположенном по адресу: Гродненский р-н, Подлабенский с/с, д. Беляны, д. 64. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадь 0,0746 га

Начальная цена продажи – 15 000 руб. (пятнадцать тысяч рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 1 500 руб. (одна тысяча пятьсот рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Лот 2: капитальное строение, инв. № 400/С-87058 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – здание магазина), общей площадью 89,0 кв. м, расположенное по адресу: Поречский с/с, д. Лихачи, ул. Школьная, 2А

Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 422087505601000080, площадь 0,0366 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Поречский с/с, д. Лихачи, ул. Школьная, 2А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохраной зоне водного объекта, код – 4,1, площадью 0,0366 га

Начальная цена продажи – 7 209 руб. (семь тысяч двести девять рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 720 руб. (семьсот двадцать рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Лот 3: изолированное помещение, инв. № 400/D-161210 (назначение – административное помещение, наименование – административное помещение), площадь 378,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 41-5; изолированное помещение, инв. № 400/D-161205 (назначение – помещение, не относящееся к жилищному фонду, наименование – нежилое помещение), площадь 38,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 41-7; капитальное строение, инв. № 400/С-102483 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженность 88,55 п. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 41; капитальное строение, инв. № 400/С-102484 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – тепловая сеть), протяженность 95,6 п. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 41; капитальное строение, инв. № 400/С-102486 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопровод), протяженность 12,35 п. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 41; электрическая сеть КЛ-0,4 кВ от РУ-0,4 кВ ТП-17 до ВУ административного здания (марка кабеля ААШв 3 х 95), протяженность 150 м; зеленые насаждения: ель 7 штук

Лот № 3 расположен на земельном участке, кадастровый номер 440100000001006134, (назначение – земельный участок для обслуживания здания административно-хозяйственного назначения), площадью 0,1982, расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 41

Начальная цена продажи – 208 750 руб. (двести восемь тысяч семьсот пятьдесят рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 20 875 руб. (двадцать тысяч восемьсот семьдесят пять рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Лот 4: капитальное строение, инв. № 401/С-11207 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – одноэтажное кирпичное здание магазина), площадь 148,7 кв. м п. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, аг. Озеры. Составные части и принадлежности: холодная пристройка, сарай, уборная

Лот № 4 расположен на земельном участке, кадастровый номер 422086505101001087, (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), площадь 0,1135, расположенном по адресу: Гродненский р-н, аг. Озеры. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в прибрежных полосах водных объектов, код – 1, площадью 0,1135 га

Начальная цена продажи – 36 000 руб. (тридцать шесть тысяч рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 3 600 руб. (три тысячи шестьсот рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Лот № 5: капитальное строение, инв. № 400/С-67595 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадь 68,5 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Одельский с/с, д. Радевичи, д. 1а. Составные части и принадлежности: сарай, площадью 32 кв. м

Лот № 5 расположен на земельном участке, кадастровый номер 422086207101000032, площадь 0,3727 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Гродненский р-н, Одельский с/с, д. Радевичи, д. 1а. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадью – 0,3727 га

Начальная цена продажи – 5 660 руб. (пять тысяч шестьсот шестьдесят рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 566 руб. (пятьсот шестьдесят шесть рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

ЛОТ 6: комплекс зданий и сооружений рынка, расположенного по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 2, в том числе:
– капитальное строение, инв. № 401/С-21527 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание административно-хозяйственное), площадь 122,3 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2 с принадлежностями: пристройка (38 кв. м), ограждение бетонное (114 кв. м), ограждение бетонное (142 кв. м), ограждение бетонное (37 кв. м), ограждение бетонное (121 кв. м), ворота металлические, калитка металлическая, площадка для мусора (9 кв. м), асфальтированная площадка (551 кв. м), навесы (2 ед. 46 кв. м), навес (45 кв. м), навес (47 кв. м), водопроводная сеть (16 п. м), электрическая сеть (18 п. м), электрическая сеть (20 п. м), ограждение из металлической сетки (27 п. м), ограждение площадки для мусора (4 м);
– капитальное строение, инв. № 401/С-21530 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), площадь 26,4 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2/1;
– капитальное строение, инв. № 401/С-21529 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание павильона «Модуль»), площадь 173,3 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2/2;
– капитальное строение, инв. № 401/С-21528 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – уборная), площадь 214,0 кв. м расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2/3;
– зеленые насаждения

Лот № 6 расположен на земельном участке, кадастровый номер 42205040000200439, площадь 1,4383 га. (назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений рынка)

Начальная цена продажи – 175 200 руб. (сто семьдесят пять тысяч двести рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 17 520 руб. (семнадцать тысяч пятьсот двадцать рублей)

Условия проведения аукциона – сохранение целевого назначения выставляемого на аукцион объекта (рынок для торговли сельскохозяйственной продукции, дикорастущими плодами, ягодами и иными продовольственными и непродовольственными товарами, а также животными)

Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 20 июля 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов.

Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 16 июля 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

## Объявление о повторных торгах

| Лоты № | Наименование имущества | Количество, мера, вес | Стоимость |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инвентарным № 200/D-92645 – административное помещение, расположенное на 1-м этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-44742 по адресу: г. Витебск, ул. Советская, д. 10а, площадь 134,7 кв. м | 1 | 173 152,07 бел. руб. |
| 2 | Изолированное помещение с инвентарным № 200/D-92656 – административное помещение, расположенное на 3-м этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-44742 по адресу: г. Витебск, ул. Советская, д. 10а, площадь 134,3 кв. м | 1 | 133 909,58 бел. руб. |
| 3 | Изолированное помещение с инвентарным № 200/D-92653 – административное помещение, расположенное на 2-м этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-44742 по адресу: г. Витебск, ул. Советская, д. 10а, площадь 134,7 кв. м | 1 | 149 156,60 бел. руб. |

| | |
|---|---|
| Собственник (владелец) имущества | Право собственности: ЗАО «КиС» (г. Витебск, ул. Советская, д. 10а-5), УНП 300299762 |
| Местонахождение имущества | г. Витебск, ул. Советская, 10а<br>По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к директору ЗАО «КиС» – Коржуеву Александру Анатольевичу, тел. + 375 29 676-94-75 |
| Наличие обременений | Залог ОАО «Белинвестбанк» |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Отдел принудительного исполнения Октябрьского района г. Витебска, ул. Кирова, д. 16, каб. 2, 13 июля 2018 года в 10.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения Октябрьского района г. Витебска, ул. Кирова, д. 16.<br>Начальник отдела – Атрахимович Николай Александрович, тел. (80212-61-62-88, тел. моб. 37533-616-17-55, эл. почта opi203@minjust.by) |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет на депозитный счет ОПИ Октябрьского района г. Витебска, р/с BY05AKBB36429030002722000000, банк – Филиал № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебск, код банка – AKBBBY21200, УНП – 300002505, с пометкой за лот № 1-2-3 ЗАО «КиС» не позднее 14.00 12 июля 2018 года.<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5 % стоимости лота.<br>В соответствии со ст. 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

## Управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего Крестьянскому Фермерскому Хозяйству «Александрова улитка» (УНП 391066310)

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 201/С-14558, площадь – 1241,3 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – Марченская средняя школа, составные части и принадлежности: тамбур, сарай, уборная, подвал, ограждение, пешеходная часть, отмостка, находящееся на земельном участке с кадастровым номером 221888502701000041, начальная цена – 18 600 рублей.<br>**Лот № 2.** Капитальное строение с инвентарным номером 201/С-14557, площадь – 547,2 кв. м, назначение – здание специализированное для образования и воспитания, наименование – школа, составные части и принадлежности: проезжая часть, пешеходная часть, ограждение (участок 1, участок 2, участок 3, участок 4, участок 5, участок 6), находящееся на земельном участке с кадастровым номером 221883002101000105, начальная цена – 5 100,00 рублей |
| Наличие обременений | Отсутствуют |
| Местонахождение имущества | Лот № 1. Витебская обл., Городокский р-н, Руднянский с/с, д. Марченки, ул. Центральная, 14.<br>Лот № 2. Витебская обл., Городокский р-н, Бычихинский с/с, д. Гурки, ул. Тюрина, 2 |
| Место, дата и время проведения торгов | 23.07.2018 г. в 12.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1<br>www.vitebskjust.gov.by)<br>Судебный исполнитель – Ткаченко Сергей Владимирович тел./факс (80212) 610424, (8033) 6879148 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано не позднее 15.00 20.07.2018 г.:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21200, УНП 300002505.<br>Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

В суд Несвижского района Минской области поступило заявление о признании умершей Хайкара Лилии Викторовны, 5 апреля 1937 года рождения, жительницы г. п. Городея Несвижского района, ул. Терешковой, д. 5 а, кв. 6. Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о данном гражданине, сообщить суду в течение двух месяцев с момента публикации объявления по адресу: г. Несвиж, ул. Садовая, 11, тел. 24408

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ЧАЙКА» г. ГРОДНО

<table>
<tr><td colspan="4">Лот № 1</td></tr>
<tr><td>Предмет торгов, краткая характеристика</td><td colspan="3">Капитальное строение, инв. № 400/С-101260 (мастерская) общей площадью 29,2 кв. м, кирпичное, 1984 г. п., составные части и принадлежности: навес; капитальное строение, инв. № 400/С-101261 (бензохранилище) общей площадью 13,7 кв. м, бетон, 1961 г. п.; капитальное строение, инв. № 400/С-101243 (склад с гаражом и мастерской) общей площадью 1118,4 кв. м, кирпичное, 1961 г. п., составные части и принадлежности: три пристройки, навес; капитальное строение, инв. № 400/С-101037 (здание гаражей с сауной) общей площадью 317,1 кв. м, кирпичное, 1961 г. п., составные части и принадлежности: пристройка, асфальтобетонное покрытие, ограждение металлическое, ворота, калитка, канализационная сеть, водопроводная сеть; многолетние насаждения (4 шт.)</td></tr>
<tr><td colspan="4">Местонахождение имущества: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Титова, 24</td></tr>
<tr><td colspan="4">Информация о земельном участке:<br>кадастровый номер 440100000001000464, площадь – 0,3250 га, целевое назначение – эксплуатация и обслуживание здания автогаража*<br>*площадка по адресу: ул.Титова, 24 в г. Гродно будет включена в состав функциональной зоны «О1см-п» – общественная смешанная пространственно городского ядра и центра. Возможна реконструкция под объект общественной полифункциональной застройки. Так же необходимо предусмотреть организацию автомобильной парковки для указанного объекта по нормативным требованиям таблицы В. 1 Приложения В ТКП 45-3.01-116-2008 «Градостроительство. Населенные пункты. Нормы планировки и застройки»</td></tr>
<tr><td>Начальная цена</td><td>268 132 рубля 80 копеек с учетом НДС</td><td>Задаток (3 %)</td><td>8 044 рубля</td></tr>
<tr><td>Сведения о продавце</td><td colspan="3">ОАО «Чайка», г. Гродно, ул. Зернова, 6, тел. 8 (0152) 74 55 02</td></tr>
<tr><td>Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка</td><td colspan="3">Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 74 49 11, номер счета BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код BLBBBY2X, УНП 500481906</td></tr>
<tr><td colspan="4">Срок заключения договора купли-продажи: в течение 20 дней после проведения торгов. Условия оплаты: по договоренности сторон</td></tr>
<tr><td colspan="4">Торги состоятся 16 июля 2018 года в 12.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8</td></tr>
<tr><td>Срок подачи документов</td><td colspan="3">По 10 июля 2018 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8</td></tr>
<tr><td colspan="4">Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by</td></tr>
<tr><td colspan="4">Дополнительная информация по тел. в г. Гродно: 8 (0152) 74 49 11, 77 23 79. Предыдущая публикация: газета «Звезда» от 21.02.2018 г.</td></tr>
</table>

**ЗАО «СМУ-77»** извещает своих акционеров о том, что отдельными акционерами в период с 14.06.2018 по 15.06.2018 поданы предложения о продаже принадлежащих им акций Общества в количестве до 2000 (двух тысяч) штук по цене 18 (восемнадцать) рублей за 1 (одну) акцию. Тел./факс 017-344-23-21.

УНП 100064641

■ Цёмнае мінулае

# Хто надзеў капелюшы на балваноў Рапануі

## Археолагі раскрылі таямніцу статуй вострава Вялікадня

**Гіганцкія 13-тонныя каменныя «капелюшы», афарбаваныя ў чырвоны колер, з'явіліся на галовах балваноў на востраве Вялікадня дзякуючы прыкладна такой жа сістэме насцілаў і стропаў, якімі еўрапейцы карысталіся для ўзняцця патанулых караблёў, заяўляюць навукоўцы ў артыкуле, апублікаваным у Journal of Archaeological Science.**



«Нам упершыню ўдалося сістэматычна выкарыстоўваць усе магчымыя намёкі і сведчанні таго, як гэтыя гіганцкія галаўныя ўборы маглі апынуцца на галовах яшчэ больш цяжкіх статуй. Усё гэта стала магчымым дзякуючы аб'яднанню метадаў археалогіі, фізікі і камп'ютарнага мадэлявання», — заявіў Карл Ліпа, антраполаг з універсітэта Бінгхэмтана (ЗША).

Востраў Вялікадня — адно з самых загадкавых месцаў на Зямлі, дзе прыкладна два тысячагоддзі таму існавала мудрагелістая цывілізацыя палінезійцаў, якая пакінула пасля сябе шматлікія сляды ў выглядзе гіганцкіх балваноў-мааі, якія, як сёння лічаць навукоўцы, уяўляюць сабой абагаўлёныя фігуры продкаў і сваякоў старажытных жыхароў вострава. Гэтая цывілізацыя фактычна знікла з твару вострава яшчэ да прыбыцця туды еўрапейцаў, прычынамі чаго лічацца дзве рэчы — заканчэнне рэсурсаў у выніку драпежніцкага вынішчэння лясоў і жывёл палінезійцамі і магчымая звязаная з гэтым вайна паміж рознымі плямёнамі абарыгенаў. Поўнае знікненне культуры мааі і носьбітаў яе мовы не дазваляе археолагам вырашыць адну з самых цікавых таямніц гэтага вострава: як на галовах некаторых балваноў, не кранутых вандаламі і часам, з'явіліся гіганцкія каменныя капелюшы, так званыя пукаа, вага якіх нярэдка дасягае паўтара дзясятка тон?

Гэтую загадку дадаткова ўскладняе тое, што самі статуі і іх «галаўныя ўборы» выраблены з розных вулканічных парод. Іх паклады размешчаны фактычна на дыяметральна процілеглых канцах вострава, аддаленых адзін ад аднаго, а таксама ад берагоў, дзе ўстаноўлены цяпер існуючыя мааі, на дзясяткі кіламетраў. Таму і дастаўка матэрыялаў да месца будаўніцтва балваноў, і іх злучэнне былі вельмі складанымі задачамі.

Ліпа і яго калегі знайшлі адказ на гэтае пытанне, які паказвае на досыць вялікую «прасунутасць» жыхароў вострава, аналізуючы артэфакты, знойдзеныя ў ваколіцах балваноў і кар'ераў, дзе былі здабытыя іх «целы» і «капелюшы», а таксама трохмерныя мадэлі саміх статуй.

Як расказвае Ліпа, яго каманда звярнула ўвагу на тое, што манера транспарціроўкі і саміх статуй, і іх галаўных убораў на такія вялікія адлегласці павінна была адлюстроўвацца ў тым, якія пашкоджанні прысутнічаюць на іх паверхні. Напрыклад, калі б статуі цягнулі па мяккім грунце або везлі на «падпорках», то на іх ніжніх частках ці спіне павінны былі застацца характэрныя драпіны і пацёртасці. З іншага боку, самі «пастаменты» балваноў і іх наваколле таксама павінны былі б захоўваць у сабе або сляды апрацоўкі капелюшоў і статуй, калі іх выраблялі на месцы, або паказваць на тое, як менавіта першыя апынуліся на другіх. Прааналізаваўшы ўсе магчымыя сведчанні падобнага роду, археолагі знайшлі адказ на гэтую загадку, які не патрабуе масавых высечак лясоў і ўдзелу ўсяго насельніцтва вострава ў пабудове адной статуі.

Як заўважылі навукоўцы, статуі былі высечаныя з пароды такім чынам, што яны самі па сабе выпросталіся, калі іх нахілялі пад невялікім вуглом. Гэта дазваляла перамяшчаць іх «крокамі», падобна таму, як уладальнікі халадзільнікаў ці цяжкіх тумбаў перасоўваюць іх на новае месца. Падобнае «выгульванне» балваноў дазваляла людзям на востраве Вялікадня рухаць іх на вялікія адлегласці, не трацячы ніякіх рэсурсаў, акрамя ўласных сіл.

Мяркуючы па малюнку драпін, капелюшы статуй перамяшчаліся да месца іх «ускладання» ў часткова гатовым выглядзе, што дазваляла старажытным мастакам у літаральным сэнсе «каціць» іх са схілу гары, дзе размешчаны кар'ер. Калі загатоўка пукаа даязджала да ідала, майстры дараблялі яе і ўзнімалі на галаву статуі, выкарыстоўваючы дасціпную, але простую сістэму пад'ёму. Яна складалася з пакатай горкі, складзенай з пяску і друзу, і вяровкі, якую старажытныя жыхары вострава абгортвалі вакол капелюша і прывязвалі да галавы статуі. Выцягваючы свабодны канец, яны паступова падымалі дзесяцітонны пукаа да вяршыні горкі, дзе капялюш паварочвалі на бок і ўсаджвалі на асноўную частку манумента.

На карысць гэтага, як адзначаюць Ліпа і яго калегі, кажа адразу шмат рэчаў — сляды падобных горак у шэрагу паваленых статуй, а таксама выемка незвычайнай формы на «капелюшы», якая не дазваляла ёй саслізгваць з галавы балвана. У дадатак навукоўцы заўважылі, што ўсе статуі першапачаткова стаялі не роўна, а былі нахіленыя пад пэўным вуглом у адносінах да паверхні Зямлі. Гэта дазваляла старажытным майстрам закочваць пукаа на галаву мааі, не пашкоджваючы абедзве часткі статуі, і затым «выраўноўваць» гатовую статую, прыбраўшы некалькі камянёў з задняга сегмента пастамента.

Усё гэта, паводле слоў навукоўцаў, кажа пра тое, што для паспяховага завяршэння манументальных «будоўляў эпохі дэспатызму» неабавязкова было мець незлічоныя арміі рабоў і велізарныя рэсурсы, як у Старажытным Егіпце ці Кітаі. Жменька тутэйшых жыхароў змагла ўвекавечыць сваё імя, выкарыстоўваючы ўласны розум, законы фізікі і бедныя мінеральныя рэсурсы вострава Вялікадня ■




■ Зямля

# КОЛЬКІ ВАЖЫЦЬ БІЯМАСА ПЛАНЕТЫ



**У параўнанні з астатняй масай усяго жывога на Зямлі на чалавецтва прыходзіцца ўсяго нічога. Але нягледзячы на такую «нязначнасць», след, пакінуты чалавецтвам на гэтай планеце, па-сапраўднаму разбуральны для ўсяго астатняга.**

Адной з галоўных мэт біялогіі як навукі з'яўляецца разуменне механізмаў функцыянавання біясферы ўвогуле, ва ўсіх яе складаных узаемасувязях, унутраных і вонкавых. Для гэтага важна мець абгрунтаваныя колькасныя ацэнкі масы жывых арганізмаў — як у цэлым, так і па асобных таксонах (групах у класіфікацыі, якія складаюцца з аб'ектаў, што аб'ядноўваюцца на падставе агульных уласцівасцяў і прыкмет). Але, як адзначаюць аўтары артыкула, надрукаванага ў часопісе Proceedings of the National Academy of Sciences, сучасных звестак аб гэтым няма.

У рамках самага ўсебаковага даследавання, накіраванага на колькасную ацэнку масы ўсіх жывых арганізмаў, якія прысутнічаюць на нашай планеце, амерыканскімі і ізраільскімі навукоўцамі было ўстаноўлена, што на долю чалавецтва прыходзіцца ўсяго нейкія 0,01 % усёй біямасы. Але нягледзячы на нашу фізічную нязначнасць у параўнанні з усёй той разнастайнасцю жыцця, якая нас акружае, гісторыя выразна паказвае, хто на самай справе дамінуе на планеце.

«Я спадзяюся, наша праца дасць яснае разуменне таго, якую дамінуючую ролю адыгрывае чалавек для ўсяго жывога на Зямлі, — кажа Рон Міла, біёлаг з ізраільскага Інстытута Вейцмана. — Яна (роля) безумоўна дзіўная і зусім непрапарцыйная нашаму месцу на планеце».

Рону Міла і яго калегам спатрэбілася каля трох гадоў на пошук і аналіз шырокай літаратуры (спіс спасылак у кароткім артыкуле дасягае паўсотні пунктаў), каб выключыць уплыў рознага ўтрымання вады ў розных арганізмах, ацэнку яны праводзілі па колькасці вугляроду, які звязаны тым ці іншым царствам жывога. Па гэтым паказчыку агульная маса ўсёй біясферы Зямлі склала каля 550 Гт (гігатон ці мільярдаў тон).

Нягледзячы на сваю каласальную колькасць (хоць, зразумела, справа ў іх памерах), вірусы складаюць толькі малюсенькую долю гэтай масы — 0,2 Гт. Безумоўнымі ж лідарамі апынуліся расліны з іх масай у 450 Гт (80 % усёй біямасы), прычым у асноўным вага прыпадае на расліны сушы: сухапутныя біяцэнозы нагул адказваюць за 470 Гт звязанага вугляроду. Другое месца адыходзіць бактэрыям, на іх прыпадае каля 70 Гт (15 %), следам ідуць грыбы — 12 Гт, археі — 7 Гт і найпрацсейшыя — 4 Гт.

Дзіўна, але жывёлы набіраюць увогуле ўсяго 2 Гт масы па вугляродзе, пры гэтым палова яе прыпадае на насякомых. Доля чалавецтва — 0,06 Гт — параўнальная з масай усёй групы тэрмітаў, але амаль у 10 разоў большая за агульную масу ўсіх дзікіх млекакормячых на планеце, якая складае каля 0,007 Гт.

А вось маса істот, абавязаных сваёй шматлікасцю чалавеку, нашмат пераўзыходзіць масу чалавецтва: так, свойскія жывёлы — рагатая жывёла, свінні і іншыя — «переважваюць» усіх дзікіх млекакормячых; маса свойскіх — большая ў 20 разоў за дзікіх. Тая ж гісторыя з птушкамі. На масу раслін мы таксама значна ўплываем: за апошнія 10 тысяч гадоў людзі скарацілі яе ўдвая.

Усе гэтыя лічбы, вядома, цікавыя, але задачай навукоўцаў было не ацаніць масу жывых істот, а знайсці галоўную крыніцу бялкоў на Зямлі. Пакуль яны яе не знайшлі, паўсталі складанасці з ацэнкай масы і складу глебавых мікраарганізмаў. Рон Міла са сваімі калегамі разлічваюць адказаць на сваё пытанне да канца гэтага года ■

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

■ Калекцыя

### У Вілейцы адкрыта экспазіцыя, прысвечаная Тадэвушу Касцюшку

# ПРАДСТАЎЛЯЮЧЫ БЕЛАРУСЬ

**На гэтых выхадных у Вілейцы адкрылася адметная творчая майстэрня калекцыянера, гісторыка Уладзіміра Ліхадзедава. Насамрэч слова «майстэрня» ў гэтай сітуацыі падаецца перамяншэннем — бо па сутнасці мы пабачылі вялікі прыватны музей. Ці ёсць аналагі яму ў нашай краіне, прыгадаць пакуль складана. Першы паверх цалкам займае выстаўка друкарскага абсталявання XVI—XX стагоддзяў. А вось другі паверх прадстаўляе наведвальнікам жыццё і дзейнасць нашага славутага земляка Тадэвуша Касцюшкі, пра яго мы і хочам расказаць чытачам «Звязды».**



«Усе экспанаты, прысвечаныя Касцюшку, не змясціліся тут — яны маглі б заняць два паверхі памяшкання. Таму я выбраў тое, што палічыў неабходным, — кажа Уладзімір Ліхадзедаў. — У ілюстраваным выглядзе паказаны ўвесь жыццёвы шлях Тадэвуша Касцюшкі і ўвекавечана яго памяць. Мной сабрана вялікая калекцыя паштовак, і ўсе прадстаўленыя тут з'яўляюцца арыгінальнымі. Ёсць паштоўкі, прысвечаныя тым мясцінам, дзе нарадзіўся славуты палкаводзец, і мясцінам яго вучобы — у Любяшове, у Брэсце, у Варшаве,



у Парыжы. На паштоўках адлюстраваны помнікі, пастаўленыя ў гонар Касцюшкі. У іншым пакоі сабрана падборка прэсы, якая пісала пра яго, — аб'ём адшуканых публікацый уражвае. Пакояў, што прадстаўляюць нашага славутага земляка, некалькі».

Уладзімір Ліхадзедаў кажа, што ўдалося адшукаць некалькі рэчаў, якія датычацца Касцюшкі, якімі сапраўды можна ганарыцца. Гэта памятны гадзіннік з яго бюстам, з унікальнай чаканкай 1875 года. Таксама вельмі цікавымі ўяўляюцца два кававыя кубачкі, набытыя ў Кракаве ў вядомага калекцыянера. Апошні сцвярджае, што яны з дома, у якім Тадэвуш жыў у Кракаве, — таму вялікая верагоднасць, што і сам палкаводзец да іх дакранаўся.

— Вельмі рады за Уладзіміра Ліхадзедава, што вянцом яго калекцыйнай працы стала такая выстаўка. Я быў у гэтым будынку некалькі гадоў таму, бачыў суцэльную разруху і, калі шчыра, нават не ўяўляў, што з таго, што было, атрымаецца стварыць такі цудоўны экспазіцыйны дом, — заўважыў **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ,** які прысутнічаў на адкрыцці. — Важна, што Уладзімір Ліхадзедаў вяртае нашай краіне імёны яе сыноў, пэўныя невядомыя выявы, якія захаваліся толькі на паштоўках. І ўсяму гэтаму надае вельмі простую, даступную форму дэманстрацыі — кнігі, паштоўкі, цэлыя экспазіцыі. Ліхадзедаў часта ўдзельнічае ў розных выстаўках, кірмашах, дзе прадстаўляе нашу беларускую зямлю, расказвае і дэманструе звесткі пра яе сыноў. Гэта з'яўляецца сапраўдным патрыятызмам.

Другая частка экспазіцыі пра Тадэвуша Касцюшку прадстаўлена аднаўленым пакоем — дакладна такім жа, у якім Касцюшка жыў у Філадэльфіі. Усё ў ім адпавядае арыгіналу: нават спецыяльна аднаўляліся шпалеры — спачатку іх перамалёўваў мастак, а пасля, па спецыяльнай замове, яны былі надрукаваныя на фабрыцы. Сваімі сіламі была адноўлена карта XVI стагоддзя. З Англіі прывезлі і адрэстаўравалі крэслы. Сабраны пісьмовыя прылады часоў Касцюшкі. Побач месціцца зграбны шахматны столік. Тут адноўлены ўмывальнік і посуд, падобным карыстаўся Касцюшка. Удалося адшукаць ложак і пасцілку даўніх часоў.



Адрозненне пакоя ў самой Філадэльфіі ў тым, што ўнутр там зазвычай не заходзяць — зрэзана частка сцяны, яна закрыта шклом — наведвальнікі зазіраюць унутр менавіта праз яго. А ў пакоі ў Вілейцы ўсё-такі зроблены дзверы, яны знаходзяцца на месцы каміна.

**Міністр інфармацыі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ,** які таксама прысутнічаў на адкрыцці, адзначыў:

— Праект «У пошуках страчанага» пачынаўся амаль 15 гадоў таму на старонках «Советской Белоруссии». Дарэчы, не памятаю ніводнай газетнай рубрыкі (акрамя такіх як «Надзённа», «Актуальна»), якая праіснавала б так доўга! Гэтыя публікацыі ішлі таксама на старонках газеты «Голас Радзімы», у часопісе «Беларусь» на пяці мовах. У гэтым праекце пачалі выходзіць і кнігі. А ўсё разам знайшло ўвасабленне ў выглядзе гэтай творчай майстэрні... Існуе такое вымярэнне як нацыянальны здабытак. Мне здаецца, у дачыненні да гэтай мясціны і самой ініцыятывы, якая, я ўпэўнены, будзе пашырацца, набываць новыя фарматы, можна ўжыць такі тэрмін — «нацыянальны здабытак». Сам Уладзімір Ліхадзедаў — адметны чалавек, ён з'яўляецца рухавіком многіх ідэй і спраў. Ён можа разварушыць астатніх, не даць ім спакою. Такіх асоб, багатых на ідэі, безумоўна, мала ў жыцці.



У творчай майстэрні Уладзіміра Ліхадзедава сапраўды ёсць што паглядзець. Аднак маецца ўсяго адно «але». Любы ахвотны трапіць унутр пакуль не зможа. Гісторык адзначае, што для таго, каб яго майстэрня запрацавала як паўнавартасны музей, патрэбна дзяржаўна-прыватнае партнёрства: аформіць уваходныя квіткі, мець магчымасць да кожнага пакоя прыставіць музейнага супрацоўніка. Пакуль жа зрабіць нейкія крокі наперад у гэтай справе ці дасягнуць папярэдніх дамоўленасцяў з вілейскімі ўладамі не ўдалося.

— Запрашаю ўсіх ахвотных далучацца і дапамагаць фонду «У пошуках страчанага». Бо далей аднаму такую справу мне не пацягнуць. На цяперашні момант я знаходжуся ў пэўным тупіку, — кажа Уладзімір Ліхадзедаў. — Побач маецца яшчэ два будынкі, якія мы пачалі крыху аднаўляць, аднак у сілу некаторых прычын, у тым ліку не атрымanага пакуль дазволу, не можам працягваць гэтым займацца. Аднак хацелася б стварыць у Вілейцы цэлы культурны гісторычна-асветніцкі комплекс, аналагаў якому ў краіне дакладна няма. Зацікаўленыя могуць далучацца да працы — і, безумоўна, штосьці карыснае за гэта атрымаюць... Дарэчы, хачу падзякаваць Міністэрству інфармацыі, газеце «СБ. Беларусь сегодня» і Выдавецкаму дому «Звязда», якія вельмі падтрымліваюць мяне ў папулярызацыі даследаванняў.

Варта адзначыць, што на другім паверсе абсталяваны таксама і «Пакой пісьменніка» — там сабраны рарытэты сярэдзіны XX стагоддзя. На пытанне, чаму менавіта «пакой пісьменніка», Ліхадзедаў адказвае, «бо я сам пісьменнік!». Цяпер вядзецца работа над адкрыццём пакоя, прысвечанага Адаму Міцкевічу.

Будзем спадзявацца, што цікавінкі творчай майстэрні Уладзіміра Ліхадзедава чытачы «Звязды» ў хуткім часе змогуць убачыць на свае вочы — не толькі ў якасці фотаздымкаў, надрукаваных у газеце і размешчаных на сайце.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ**

■ Запрашальнік

# ЗАХОДЗЬЦЕ НА «КВАС З ПРЫКРАСАМІ»!

**Рэгіянальны фэст традыцыйнай культуры «Пятровіцы» пройдзе з 9 да 12 ліпеня. «Пятровіца» — гэта навучанне танцам і спевам, жывая музыка, пасядзелкі каля вогнішча і несупынныя танцы, цікавыя знаёмствы з гасцямі фэсту і шчырымі мясцовымі носьбітамі культуры, родная мова, вольнае паветра вёскі, смачныя традыцыйныя стравы і шмат чаго яшчэ.**

«Пятровіца» адбудзецца на Любаншчыне восьмы раз. Гэта значыць, восьмы раз у вёску Шыпілавічы Любанскага раёна з'едуцца зацікаўленыя людзі з усёй Беларусі, а таксама блізкага і не надта блізкага замежжа. Прыедуць, каб танцаваць і спяваць, касіць і жаць, хлеб пячы і выцінанкі выразаць, адчуць атмасферу традыцыйных вячорак, адпачыць ад гарадскога шуму і проста добра правесці час.

З 9 да 12 ліпеня адбудуцца майстар-класы па танцах ад этнахарэографа і фальклярыста Сяргея Выскваркі — мастацкага кіраўніка ўзорнага фальклорнага танцавальнага калектыву «Верабейкі», якому сёлета спаўняецца 25 гадоў. Сяргей Выскварка падзяліцца ведамі, якія атрымаў яшчэ ад сваёй бабулі, а папоўніў і сістэматызаваў ужо падчас сур'ёзнай даследчыцкай працы. «Полька», «Падэспань», «Каханачка», «Нарэчанька», «Кракавяк», «Лявоніха» — гэта няпоўны спіс танцаў, якія можна будзе паспрабаваць патанчыць.

Арганізатары адзначаюць: «Акрамя заняткаў, танцуем мы ў любое надвор'е і паўсюль: у сельскім клубе і каля клуба, у старой хаце і на асфальце, у чыстым полі і ў дварах вяскоўцаў».

Удзельнікі «Пятровіцы» змогуць засвоіць тэхніку традыцыйнага спеву пад кіраўніцтвам Вольгі Емяльянчык, удзельніцы і сузаснавальніцы фальклорнага гурта GUDA (Мінск), мастацкага кіраўніка фальклорнага гурта «Варган» (г. Полацк). Вольга Емяльянчык дапаможа раскрыць свой голас, навучыць атрымліваць радасць ад супольнага спеву, паглыбіцца ў гукавую стыхію найлепшых узораў пятроўскіх абрадавых песень і пазаабрадавай лірыкі Любаншчыны. У мужчын ёсць унікальная магчымасць павучыцца спевам ад таленавітага і самабытнага Уладзімера Ціханоўскага.

Акрамя танцаў і спеваў, удзельнікаў чакаюць вандроўкі ў горад Любань, вёскі Пласток і Жораўка — там можна будзе атрымаць эстэтычнае і гастранамічнае задавальненне. Удзельнікі гурта «Напарачка» будуць чакаць ахвотных, каб прадэманстраваць танцы з



Любанскай дзясяткі і пачаставаць традыцыйнымі стравамі роднай зямлі.

На сваёй радзіме, Сяргей Выскварка пакажа вынікі аднаўлення дзедавага дома, навучыць танцаваць рэдкія мясцовыя танцы і запросіць на «квас з прыкрасамі». Не будзе прамінута і традыцыйная вечарына ў вясковай хаце, гаспадар якой абяцае пачаставаць хатнім півам.

Арганізатары запрашаюць далучацца ўсіх ахвотных. Даведацца болей і зарэгістравацца можна на сайце http://piatrovica.by.

**Варвара ГОМАН**

Пантэон Айчыны

# МІКАЛАЙ РАДЗІВІЛ ЧОРНЫ

*(04.02.1515 — 28/29.05.1565)*

**Ён атрымаў нямала перамог, але не зброяй на полі бітваў, а словам і справай за дыпламатычным сталом або ў соймавай зале. І гэтыя перамогі былі вартыя самых бліскучых вайсковых трыумфаў.**



Намаганнямі Мікалая Радзівіла па мянушцы Чорны да Вялікага Княства Літоўскага была далучана Лівонія, а з Маскоўскай дзяржавай доўгія гады захоўваўся мір. Ён зрываў планы польскіх паноў далучыць ВКЛ да Польскага Каралеўства. Урэшце, узначаліў рэфармацкі рух у краіне. Надзелены вялікай уладай, вырашаў дзяржаўныя справы не сілай, а згодай і словам.

У юнацтве Чорны разам са стрыечным братам Мікалаем Радзівілам, празваным Рудым, выхоўваўся пры каралеўскім двары, дзе яны пасябравалі з юным каралевічам Жыгімонтам Аўгустам. У далейшым гэтае сяброўства перарасце ў палітычнае супрацоўніцтва. Жыгімонт Аўгуст ацэніць разважлівасць і актыўнасць Мікалая Чорнага і ваенны талент Мікалая Рудога. А іх палітычнае супрацоўніцтва пачалося з таго, што браты Радзівілы праз свае сувязі з магнацкімі родамі паспрыялі агітацыі сярод ліцвінскай шляхты аб перадачы вялікакняжацкай улады Жыгімонту Аўгусту. На Берасцейскім сойме ў 1545 годзе Жыгімонт Казіміравіч перадаў уладу ў ВКЛ сыну. А Чорны атрымаў ад удзячнага гаспадара высокую пасаду земскага маршалка, адказнага за правядзенне соймаў. Аднак гэтымі абавязкамі роля Чорнага не абмежавалася. Ён зрабіўся першым дарадцам вялікага князя, выканаўцам яго спраў. У тым ліку і шлюбу з Барбарай Радзівіл. Чорны паклаў шмат сіл і грошай, каб гэты шлюб прызнала польская і ліцвінская шляхта і Барбару прызналі каралевай. Для падвышэння родавай годнасці Мікалай Чорны за вялікія грошы атрымаў ад імператара Карла V у 1547 годзе Радзівілам ганаровы тытул князёў Свяшчэннай Рымскай імперыі.

За кароткі тэрмін Чорны стаў канцлерам, віленскім ваяводам і берасцейскім старостам — па значнасці і ўплыве першым вяльможам у краіне, а калі гаспадар адсутнічаў, — фактычным яе кіраўніком. Пра яго магутнасць тады вобразна казалі «Дзе канцлер Чорны прывяжа карову ў Літве ці ў Польшчы, там яна стаіць і стаяць будзе». Гаспадар цалкам апынуўся пад уплывам свайго дарадчыка і вяльможы. Сучаснікі тлумачылі гэта нейкім чарадзействам Чорнага. «Тое, што ён параіць, нагаворвае, што скажа і што пажадае, тое кароль чыніць, не зважаючы ні на чыю раду, у справах рэлігійных, ці справах панства, ці іншых важных справах», — сведчылі пра абсалютную ўладу Чорнага над сваім гаспадаром. У сенаце кароль падымаўся з трона, ішоў насустрач Радзівілу і садзіў каля сябе, тым самым падкрэсліваючы яго выключнае становішча.

Не без падстаў лічылі, што ў выпадку смерці Жыгімонта Аўгуста Мікалай Чорны мог стаць правіцелем Вялікага Княства Літоўскага. А ён і не хаваў гэтага і лічыў сябе вартым вялікакняжацкага пасада. Затое яго справы былі велікакняжацкімі. Галоўным яго клопатам было захаванне міру з суседнімі краінамі. «Я заўжды думаю пра спакой», — не раз казаў ён, «смяротным боем» біўся з гетманамі Мікалаем Рудым і Рыгорам Хадкевічам, каб стрымаць іх агрэсію супраць Лівоніі. Вёў перамовы з маскоўскімі пасламі, каб «кровь бы ся христьянская невинная на обе стороны не разливалася».

Мір патрэбны быў для грандыёзных пераўтварэнняў у Вялікім Княстве Літоўскім. Па даручэнні гаспадара Чорны праводзіў у краіне маштабную аграрную рэформу, гэтак званую валочную памеру. Прыводзілася да ладу сістэма дзяржаўнага землекарыстання, што закранула інтарэсы, як шляхты, гэтак сялянства і гарадоў. Канцылярыя была завалена скаргамі на злоўжыванне рэвізораў, якія праводзілі рэвізію зямель. Як кожная «навіна», рэформа ламала звыклы ўклад жыцця і выклікала незадаволенасць людзей. Пакрыўджаныя наракалі на Чорнага, нібыта ўсе беды ішлі ад яго. Адначасова Чорны падрываў звыклы лад рэлігійнага жыцця. Прыняўшы радыкальную плынь пратэстантызму — кальвінізм, Чорны пачаў уводзіць у сваіх уладаннях новую веру. Гэта была яго духоўная патрэба — стварэнне народнай царквы. «Закладаючы ў сваіх уладаннях і там, куды мая ўлада сягае, зборы і алтары новай веры, раблю тое дзеля вяртання сапраўднай веры Хрыстовай, вольнай ад папскіх прыдумак ідалапаклонства. Нашыя прапаведнікі добра ведаюць праўдзівую навуку Хрыстовую, прапаведуюць не каноны і дэкрэты, а словы вечнага жывога Госпада Бога», — заяўляў Радзівіл. З падтрымкі Чорнага ў Літве пашыралася кнігадрукаванне. У 1563 годзе выйшла славутая Берасцейская біблія на польскай мове. Сымон Будны выпускаў свае беларускамоўныя творы.

Амаль усе вярхі магнатэрыі ўслед за Радзівіламі зрабіліся пратэстантамі. Гэта была ўнікальная з'ява ў гісторыі ВКЛ, як духоўная, гэтак і палітычная, якая магла вывесці краіну з крызісу. На жаль, перамагла контррэфармацыя.

Вырашальную ролю адыграў Мікалай Чорны ў далучэнні да ВКЛ Лівоніі. Пасланы гаспадаром у Рыгу на перамовы, ён пераступіў свае паўнамоцтвы і прапанаваў лівонцам распусціць іх ордэн і перапатрыраць Лівонію ў свецкае герцагства, якое на роўных увойдзе ў ВКЛ. Ордэн і рыжскі магістрат пагадзіліся з прапановай Чорнага. Жыгімонт Аўгуст хоць і быў незадаволены ініцыятывай свайго падданага, але вымушаны быў прыняць яе. Віленскі сойм у 1561 годзе пагадзіўся, каб «земли Лифляндское з иншими панствы нашими за ровно статися».

Адначасова Чорны як канцлер узначальваў працу над стварэннем другога Статута Вялікага Княства Літоўскага. Шэраг артыкулаў павінны былі гарантаваць ВКЛ дзяржаўную незалежнасць ад захопніцкіх дамаганняў палякаў. На соймах Чорны горача выступаў супраць польскіх прапаноў далучыць ВКЛ да Польшчы. Пагроза ўзрасла пасля таго, як Жыгімонт Аўгуст стаў на польскі бок. Узрушаны Мікалай Чорны заявіў, што нельга служыць такому гаспадару. Ён гатовы быў зброяй абараняць Літву ад пагрозы навязаць ёй «нягодную унію» на найбліжэйшым сойме ў 1565 годзе. Чорны на чале 6-тысячнага войска заняў Вільню. Гэтая акцыя на час астудзіла захопніцкі запал палякаў і адцягнула Люблінскую драму на некалькі гадоў. Трэба было вырашыць праблему Чорнага, і яна была вырашана. Усёмагутны магнат раптам захварэў і не перамог, як высветлілася, смяротнай хваробы. Незадоўга перад смерцю ў лісце да брата Мікалая Рудога ён з надзеяй пісаў: «Прыйдзе час, і буду ў каталогу, сярод тых грамадзян, якія добра служылі сваёй дзяржаве». Яму так хацелася, каб яго справы былі карыснымі для яго краіны і яе людзей, каб нашчадкі добрым словам згадалі яго імя.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

■ Сваімі словамі

# ЖЫВЫ ГОЛАС ГІСТОРЫІ



**Ёсць людзі, месцы, падзеі, здольныя паўплываць на наша жыццё. Змяніць светабачанне, падкарэктаваць арыенціры і зрабіць пераацэнку жыццёвых каштоўнасцяў. Таму тым, хто хоча паўней адкрыць для сябе наша мінулае, глыбей зразумець яго і ў пэўным сэнсе перажыць самому, дапаможа гэта зрабіць валанцёрскі летнік у гістарычным месцы. І свет ужо не будзе ранейшым. Як той казаў, аднойчы расшыраная свядомасць ужо ніколі не звузіцца.**

Летнікі бываюць розныя. Хтосьці праводзіць іх у старажытным замку, як, напрыклад, дабрачынныя фонды «Любчанскі замак» і «Крэўскі замак». Тады ўдзельнікі могуць у самым прамым сэнсе дакрануцца да старажытнага мура. Пад наглядам прафесійных рэстаўратараў часам надараецца магчымасць папрацаваць, напрыклад з часткамі сцен, якія дабудоўваюць, патынкаваць аднойлены камін, пакрысць спецыяльным растворам дошкі ў фахверкавай пабудове. Хтосьці ладзіць талаку — усе ўдзельнікі разам наводзяць парадак каля пэўнай гістарычнай пабудовы. Зусім нядаўна адбылася такая ў палацы ў Шчорсах. А некалькі гадоў таму, калі яшчэ толькі распачыналіся аднаўленчыя работы ў сядзібе Агінскіх у Залессі, валанцёры першымі дапамагалі добраўпарадкоўваць тэрыторыю.

Заўсёды прыемна прычыніцца да тых змен, якія адбываюцца на важным гістарычным аб'екце. І такім чынам падбаць пра яго дабрабыт не толькі словамі, але і справай. Падчас такой дапамогі адбываецца поўнае паглыбленне ў гісторыю і таямніцы гэтых мясцін. Ты вывучаеш усё знутры, знаходзячыся на месцы важных падзей, больш поўна ўсведамляеш іх невыпадковасць — і тое, як яны паўплывалі на дзень сённяшні.

Аднак работы — гэта толькі адзін бок медаля. Звычайна арганізатары летнікаў імкнуцца падрыхтаваць і якую-небудзь культурную праграму — запрасіць музыкаў, зладзіць паездку ў навакольныя адметныя месцы. Калі побач рака ці возера, то ў дзённы час (калі вельмі спякотна, каб працаваць) можна пакупацца, паплаваць ці нават сплавіцца ўніз на надзіманым матрацы. А пасля спыніцца каля самага прыгожага пясчанага схілу, узабрацца на яго, крыху адпачыць там і глядзець, як прыгожа адтуль глядзіцца замак ці сядзіба: на такой адлегласці яны падаюцца ўжо зусім невялікімі. Выцягваеш гарызантальна далонь — і гістарычны цуд ужо амаль змяшчаецца на ёй...

Валанцёр — гэта не турыст. Той, хто працуе, душой, сэрцам і розумам спрычыняецца да гістарычнага помніка. І ўжо пэўна ўсё сваё жыццё будзе адчуваць адказнасць за яго. Жаданне дапамагчы яшчэ чым-небудзь. Прыехаць і паглядзець, ці ўсё там у парадку, проста адчуць знаёмую, без перабольшання чароўную атмасферу. І зноў задаць тое ж пытанне: «Чым я магу дапамагчы?..»

Даводзілася мне быць валанцёрам і на археалагічных раскопках. І гэта яшчэ адзін цуд. Спачатку з трымценнем чакаеш, ці аддасць зямля свае скарбы, ці прыадкрые таямніцу?.. Акуратна, прытрымліваючыся тэхналогіі раскопак, слой за слоем здымаеш зямлю. Напачатку можаш адчуваць лёгкае расчараванне — замест жаданых рэчаў трапляецца адно смецце. Аднак нават невялічкія кавалкі кафлі ці збаночкаў мінулых часоў — гэта ўжо радасць, жывы голас гісторыі, які пачынае да



цябе прамаўляць. І ты ўжо ведаеш гісторыю знаёмых месцаў не па кнігах, не з тых шаблонаў, якія сфарміраваліся даўно і невядома кім. Ты бачыш мінулае на свае вочы. І, прыслухоўваючыся да тлумачэння спецыялістаў, ведаеш, што, як і чаму было раней на гэтай зямлі, — хто б і што б ні казаў пазней.

Да таго ж валанцёрскі выезд — гэта заўсёды жыццё ў пэўным цікавым месцы. Ці то прыбудова да замка, ці дом мясцовага жыхара, які гасцінна пагадзіўся адчыніць яго для гасцей, што прыехалі вывучаць мінулае і працаваць з ім. Памятаю, што падчас раскопак каля Белавежскай пушчы побач з намі хадзіла маленькае зубраня, прыручанае мясцовымі жыхарамі. Яго можна было карміць проста з рук, гладзіць. А ў мястэчку Любча, што пад Навагрудкам, надзвычай шмат буслянак. Аднойчы на велізарным дрэве каля замка ўдалося налічыць адразу 30 буслоў! Іх сапраўды шмат у гэтай мясцовасці. Пагадзіцеся, такога не ўбачыш, застаючыся дома ў чатырох сценах.

Гэта лета таксама вабіць тых, хто гатовы збочыць са звыклых сцяжын і папрацаваць на карысць спадчыны. Упэўнена, што ў кожнай вобласці, калі пашукаць, паспытваць мясцовых актывістаў, знойдзецца па летніку, да якога можна далучыцца і папрацаваць. Аднак ёсць два археалагічныя выезды, якія ўжо набіраюць аматараў даследаваць спадчыну.

Віляйчане запрашаюць ахвотных прыняць удзел у археалагічным летніку «Нясцёркі-2018». Археалагічныя даследаванні па вывучэнні крывіцкіх курганоў канца І — пачатку ІІ тысячагоддзя нашай эры будуць праводзіцца ў Вілейскім раёне Мінскай вобласці з 16 па 30 ліпеня 2018 года. Навуковым кіраўніком летніка будзе кандыдат гістарычных навук, дацэнт Мікалай Плавінскі, свае пытанні можна накіроўваць на яго электронную скрыню plavinski.arc@gmail.com. Побач з месцам даследаванняў знаходзіцца Вілейскае вадасховішча, дзе можна будзе прабавіць крыху вольнага часу. Таксама арганізатары абяцаюць, што на летніку адбудуцца выступленні музыкаў, гісторыкаў, краязнаўцаў.

Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры запрашае прыняць удзел у археалагічным летніку «Наўры-2018». У Мядзельскім раёне Мінскай вобласці з 1 па 15 жніўня адбудуцца археалагічныя даследаванні па вывучэнні пахаванняў крывічоў. Група маладых аматараў гісторыі і археалогіі правядзе раскопкі крывіцкіх курганоў Х — пачатку ХІІ стагоддзя. На летніку чакаецца таксама шмат музыкі, сяброўскай камунікацыі і сюрпрызаў. Каардынуе правядзенне летніка намеснік старшыні таварыства аховы помнікаў Юрый Меляшкевіч, з якім можна звязацца праз электронную скрыню meliashkevich@gmail.com.

Наперадзе яшчэ больш як два летнія месяцы. Не прапусціце сваю магчымасць жыць цікавым, насычаным і шчаслівым жыццём!.. Угледзіцеся ў твар гісторыі. Ён вам дакладна спадабаецца.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Червенское районное потребительское общество |

**Предмет аукциона**
**Местоположение – Минская обл., Червенский р-н**

| Наименование (назначение) | Общ. пл. | Инв. номер | Адрес (населенный пункт) |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | | | |
| **Здание майонезного цеха** (здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака) | 203 кв. м | 615/С-16211 | г. Червень, ул. К. Маркса, д. 21 |
| Составные части и принадлежности: пристройка, сарай | | | |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0724** га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания майонезного цеха | | | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 86 659,97 бел. руб.** (снижение 10 %) | | | |
| **Лот № 2** | | | |
| **Магазин № 5** (здание специализированное розничной торговли) | 75,9 кв. м | 615/С-15962 | г. Червень, ул. Зои Космодемьянской |
| Составные части и принадлежности: пристройка, сарай | | | |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0140** га предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли | | | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 12 586,95 бел. руб.** (снижение 10 %) | | | |
| **Лот № 3** | | | |
| **Магазин № 2** (здание специализированное розничной торговли) | 427,9 кв. м | 615/С-16290 | Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. К. Маркса, д. 9 |
| Составные части и принадлежности: пристройка, два сарая пристройки, топочная | | | |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1793** га предоставлен на праве аренды по 29.01.2028 для обслуживания здания магазина № 2. Ограничения (обременения) прав – охранные зоны сетей и сооружений водоснабжения, пл. 0,0406 га | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 133 291,66 бел. руб.** (снижение 10 %) | | | |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи. **По лоту № 2** предусмотрено предоставление рассрочки платежа сроком на 3 (три) месяца

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущие извещения о проведении аукциона по лотам №1–2 опубликовано в газете «Звязда» от 15.04.2018, по лоту № 3 в газете «Звязда» от 11.05.2018 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **06.07.2018** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **04.07.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении повторных торгов в виде открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Быховский консервно-овощесушильный завод»**

**Лот № 1**: пресс пневматический PE-50, инв. № 41787. Начальная цена продажи: 138 960,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка 13 896,00 бел. руб.
**Лот № 2**: ферментатор EV-346, инв. № 41786. Начальная цена продажи: 70 200,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка 7 020,00 бел. руб.
**Лот № 3**: наполнитель огурцов с вибрационной плитой Fenco, инв. № 41610. Начальная цена продажи: 118 800,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка 11 880,00 бел. руб.
**Лот № 4**: этикетировочная машина для бутылок XR4T 1S, инв. № 27367. Начальная цена продажи: 66 240,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка 6 624,00 бел. руб.
**Лот № 5**: бутыломоечная машина БЗ-АММ-6. Начальная цена продажи: 54 270,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка 5 427,00 бел. руб.
**Лоты №№ 6–9**: емкости горизонтальные для нефтепродуктов № 1, № 2, № 3, № 4, объемом 50 куб. м каждая. Начальная цена продажи каждого из лотов 6-9: 1 080,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка 108,00 бел. руб.
**Лоты №№ 10–19**: емкости горизонтальные пищевые объемом 50 куб. м каждая, инв. № 1140-1143, 1145-1150. Начальная цена продажи каждого из лотов 10–19: 1 530,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка 153,00 бел. руб.
**Лоты №№ 20–21**: емкости горизонтальные объемом 60 куб. м каждая, инв. № 2071, 2072. Начальная цена продажи каждого из лотов 20-21: 1 260,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка 126,00 бел. руб.
**Лоты №№ 22-27**: емкости вертикальные пищевые объемом 50 куб. м каждая, инв. № 1130-1135. Начальная цена продажи каждого из лотов 22-27: 1 080,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка 108,00 бел. руб.
**Лоты №№ 28–31**: емкости вертикальные пищевые объем 60 куб. м каждая, инв. № 1136-1139. Начальная цена продажи каждого из лотов 28-31: 1 170,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка 117,00 бел. руб.

| | |
|---|---|
| **Продавец** | ОАО «Быховский консервно-овощесушильный завод» УНП 700183696, Могилевская обл., г. Быхов, ул. Красноармейская, 26 |
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 12 июля 2018 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 11 июля 2018 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | Победитель аукциона обязан в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи. Оплата за предмет аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи |

Информация о предыдущем аукционе была опубликована в номере газеты «Звязда» от 04.04.2018

Участник, выигравший торги, уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона в соответствии с выдаваемым в день проведения аукциона счетом-фактурой.

Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 222 72-41-14, +375 29 624-26-25, +375 44 738-18-99

## Ликвидатор объявляет о проведении третьих повторных торгов в связи с продажей имущества НТООО «ТетраСистемс» (УНП 101035494)

– ПЭВМ HAFF «Maxima» (2013, Intel Core I5 3330, 4 G DDR3). Начальная цена 350,00 бел. руб., без НДС;

– книги собственного производства в ассортименте (абитуриентская, учебная, деловая, справочная, экономическая и юридическая литература) 196 наименований в количестве 24 840 экземпляров. Начальная цена 9586,75 бел. руб., без НДС.

Торги в виде аукциона состоятся 29.06.2018 в 12.00 по адресу: г. Минск, пер. Северный, д. 13/2-8 (по месту нахождения организатора торгов). Ознакомиться с предметом торгов можно по месту его нахождения: г. Минск, пер. Северный, д. 13/2-8, предварительно согласовав дату и время с продавцом.

Шаг аукциона – 5 процентов.

Продавец – НТООО «ТетраСистемс», тел. (8-017) 200-09-46.

Организатор торгов – ликвидатор НТООО «ТетраСистемс», (220036, г. Минск, пер. Северный, д. 13/2-8, тел. (8-017) 200-09-46).

Прием заявок начинается с момента выхода объявления, осуществляется по месту нахождения организатора торгов и прекращается за пять дней до начала торгов.

Задаток вносится до подачи заявления на участие в торгах в размере 10 процентов от начальной цены предмета торгов на р/с BY09-BLBB30120101035494001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, BIC BLBBBY2X, УНП 101035494, получатель – НТООО «ТетраСистемс», назначение платежа: задаток за предмет торга.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня их проведения.

Извещение о проведении вторых повторных торгов было опубликовано в газете «Звязда» 30.05.2018.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению торгово-производственного унитарного предприятия «Слуцкая база ОПС» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **столовой** общей площадью **232,4 кв. м,** инв. № **640/С-26651**, расположенной на земельном участке с кадастровым номером **624682001601000629** (предоставлен на праве аренды) площадью **0,1313 га**, по адресу: **Минская область, Слуцкий район, Гресский с/с, аг. Греск, ул. Пролетарская, 2**.

Начальная цена с НДС (20 %) – **10 440,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **1 044,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **20.07.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.07.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

## ООО «Центр Белинвентаризация»
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**
- ✓ **Оценка всех видов собственности**

**Извещает о проведении аукциона по продаже имущества ОАО НТК «АЛЕСЯ», тел. 8 (0232) 29 51 12**

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение (торговое помещение) с инв. № 350/D-331447 площадью 76,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 301-3. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000007005030 площадью 0,2934 га (доля в праве постоянного пользования – 97/100). Цель использования – любая, кроме розничной торговли продтоварами | **133 000,00** | **13 300,00** |
